...ры' Усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

...ган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 132 (4036)
АЎТОРАК, 19 МАЯ 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫНКА

ГПБ Ср. Кв.

...е здаваць пазыцый

...рочна гіганцкая роля МТС у ба... за бальшавіцкую сяўбу. МТС— ... калектывізацыі. Яны зьяў... апорнымі пунктамі сацыялі... рэканструкцыі вёскі. МТС пра... ...ць шлях да новых перамог у ...соцыяльнай калектывізацыі і на ...ве ліквідацыі кулацтва.

...ючую вясну на МТС ускладзены ...кшыя задачы. Неабходнасьць ра... ...шчыняць тэрміны сяўбы значна ...ышае патрабаваньні да машына... ...ных станцый, як перадавых ... за тэмпы палявых работ. Свая... ...е выкананьне праграмы сяўбы ня ...забясьпечана бяз правільнай арга... ...ці працы ў калгасах, без баявой і ...ная расстаноўкі сіл.

...ына-трактарныя станцыі ёсьць СРЭДНЯЯ АРГАНІЗАТАРЫ калг... ...працы. Яны павінны забясьпе... ...у кожным калгасе пераход на ...льшчыну, ацэненую ў працаднёх, ...ьдзельшчына—аснова правільнай ...ацыі калгаснай вытворчасьці.

...сяўбы па збожжавых раёнах ...паказвае, што МТС БЛІСКУЧА ...НЯЮЦЬ ГЭТЫЯ ЗАДАЧЫ. На ...ным фронце МТС Украіны, ...ўказу, Крыму атрымліваюць ПЕ... ...ГУ ЗА ПЕРАМОГАЙ. Гэтага НЕЛЬ... ...КАЗАЦЬ пра нашы машына-трак... ...ыя станцыі. Беларускія МТС ГА... ...ДА ЦЯГНУЦЦА Ў ГЛЫБОКІМ ...Е ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ. Сёнешнія ...і сяўбы па МТС ня толькі зьяўля... ...невыстарчальнымі, а проста ства... ...СУР'ЁЗНУЮ ПАГРОЗУ свая часо... ...сканчэньню палявых работ.

15 мая машына-трактарныя стан... ...ССР выканалі плян сяўбы ўсяго ...НА 8,7 ПРОЦ. Мінулая пяцідня... ...ла злачынна невыстарчальны пры... ...Гэта ярка сьведчыць аб тым, што ...на-трактарныя станцыі і да гэта... ...су не разгарнулі масавай сяўбы. ...у паўднёвых раёнах яшчэ ні адна ...НЕ ЎЗЯЛА патрэбных тэмпаў ра...

...ТКАВІЦКАЯ МТС, напрыклад, вы... ...а свой плян пакуль што толькі на ...рсц. Зусім нецярпімую, ганебную ...ьнасьць праяўляюць ВЕТРЫН... ...Я, АСЬВЕЙСКАЯ, СІРОЦІНСКАЯ, ...ДОЦКАЯ, ДУБРОВЕНСКАЯ, МЕН... ...Я, КАСЬЦЮКОВІЦКАЯ, БОРКА... ...АЯ і інш. МТС. Па гэтых МТС па... ...плян выканан у сярэднім толькі ...3 проц.

...прычыны, дзе карэньні гэтых ...кіх прарываў? Матар'ялы, зьме... ...ныя ў сёнешнім нумары «Зьвязды», ...выразны і вычарпальны адказ. ...зьлічка ў МТС і па сёнешні дзень ...а НЯПОЎНАСЬЦЮ ліквідавана. ...нізацыя працы ў машына-трактар... ...станцыях, як правіла, знаходзіцца ...ам НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМ стане. ...вая работа таксама амаль зусім НЕ ...ГОРНУТА. Адсюль і пачынаецца ...ца ўсіх прарываў.

...раўды, хто як не МТС павінны ...паказаць прыклад у барацьбе за ...льшчыну. На справе-ж гэтага няма. ...лютная большасьць МТС яшчэ не ...шла на зьдзельшчыну, а калі і пе... ...ла, дык толькі ФАРМАЛЬНА. На ...ці дзень мы маем нямала машына... ...рных станцый, дзе пытаньне аб ...ьдзельшчыне [illegible]

...На дзіва таму, што эфэктнасьць ра... ...трактараў яўна НЕВЫСТАРЧАЛЬ... ...Трактары працуюць з далёка няй... ...часамі проста мізэрнай нагрузкі. ...Мы дарожым кожнай гадзінай, кож... ...трактараднём. А з месц паступаюць ...кі фактаў аб тым, што трактары ...юць па 10, ды нават і менш га... ...у суткі.

...рэньшчына, адкрытая ці замаскава... ...ная і да гэтага часу практыкуецца ...ым радзе машына-трактарных стан... ...балюча б'е па тэмпах сяўбы. Трак... ...ты ў пераважнай большасьці вы... ...ў ня маюць цьвёрдых норм выпра... ...Абязьлічная язда на трактарах ...дзіць да значнай колькасьці пра... ...і паломак. Нормы ўдарнікаў, якія ...даюць сапраўдныя ўзоры ў барацьбе ...тэмпы бальшавіцкай сяўбы, не па... ...ны ў практыцы МТС. Такое ста... ...ня зьяўляецца ЗУСІМ НЕЦЯРПІ... ...У бліжэйшыя дні кожная МТС ...на перайсьці на зьдзельшчыну. Ні... ...маруды дапускаць нельга. ...ЕЛЬШЧЫНУ—ГЭТЫ МАГУТНЫ ВАГАР САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПА... ...БОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА—ТРЭБА ЗАРАЗ-ЖА ЎКАРАНІЦЬ ВА ЎСЕ МТС.

Усе работы машына-трактарных станцый павінны быць пераведзены на зьдзельшчыну. Трэба рашуча дабівацца выкананьня гэтай задачы ў максымальна кароткі тэрмін.

Прарывы ў рабоце МТС у немалой ступені тлумачацца тым, што многія машына-трактарныя станцыі яшчэ НЕ ПЕРАЙШЛІ на гаспадарчы разрахунак. Гэта нараджае расхлябанасьць і нядбайнасьць. Зараз-жа КОЖНАЯ МТС ПАВІННА ПЕРАЙСЬЦІ НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК. Далей нельга цярпець ніякіх адтэрмінаваньняў.

Красавіцкі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б з усёй рэзкасьцю падкрэсьліў, што МТС зусім НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА змагаюцца за тэмпы калектывізацыі.

Трэба рашуча канстатаваць, што і зараз машына-трактарныя станцыі НЕВЫСТАРЧАЛЬНА ВЫКОНВАЮЦЬ СВАЮ РОЛЮ АРГАНІЗАТАРАЎ НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ. Яны ня здолелі арганічна злучыць веснавую сяўбу з барацьбой за ўцягненьне новых аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы. Процант калектывізацыі ў раёнах дзейнасьці МТС яшчэ даволі нізкі. У цэлым радзе раёнаў машына-трактарныя станцыі зьяўляюцца не рухавікамі калектывізацыі, а простымі пракатнымі пунктамі.

Нашы МТС пакуль зусім дрэнна, за адзінкавымі выключэньнямі, змагаюцца за ўкараненьне зьдзельшчыны ў калгасах, за правільную арганізацыю калектыўнай працы. Яркі прыклад—факты з практыкі Стара-дароскай машына-трактарнай станцыі. Гэта МТС ня прымае ніякага ўдзелу ў правядзеньні веснавой сяўбы па калгасах. Калгасы прадастаўлены самі сабе. Ніякай дапамогі ад МТС яны не атрымалі. Што робіцца ў калгасах, як у іх арганізавана праца, ці перайшлі яны на зьдзельшчыну з улікам у працаднёх, як яны праводзяць палявыя работы,—усе гэтыя вузлавыя цэнтральныя пытаньні Старадароскую МТС ня цікавяць. Такая «работа» стварае дасканалую глебу для кулацкай агітацыі. Кулак выкарыстаў злачынную бязьдзейнасьць Стара-дароскай МТС для таго, каб разгортваць сваю падрыўную шкодніцкую работу. І зусім невыпадкова, што ў гэтым раёне ў паасобных калгасаў пачаўся адліў.

Відавочна, што кіраўнікі Стара-дароскай МТС заражаны апартунізмам і праводзяць кулацкую палітыку і практыку. Такіх «кіраўнікоў» трэба безадкладна зьнімаць з работы і прыцягваць да суровай адказнасьці.

Карэнны і прытым неадкладны перапром у рабоце МТС павінен быць заразжа дасягнут. Перавёўшы на зьдзельшчыну ўсю работу, устанавіўшы цьвёрдыя нормы выпрацоўкі, разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, МТС абавязаны ня толькі ліквідаваць ганебны прарыў у разгортваньні сяўбы, але і дабіцца перавыкананьня пасеўнага пляну.

Абязьлічка павінна быць з коранем вырвана з практыкі кожных машына-трактарных станцый. Усе МТС абавязаны разрахунак.

Задача партыйных і прафсаюзных арганізацый—забясьпечыць рашучы ўздым масавай работы сярод рабочых машынатрактарных станцый.

За тэхніку, за рацыянапізацыю, за максымальную эканомію гаручага МТС павінны змагацца з неаслабнай энэргіяй.

МТС абавязаны вўпадаць вышынямі тэхнікі з тым, каб яшчэ з большым посьпехам змагацца за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

Узьнясь хвалю новага калгаснага прыпіву, цесна злучыць сяўбу з барацьбой за нарастаньне тэмпаў калектывізацыі, стаць сапраўдным арганізатарам працы ў калгасах—галоўнейшыя задачы кожнай машына-трактарнай станцыі. На іх ажыцьцяўленьне павінны быць кінуты ўсе сілы.

ДА 1 ЧЭРВЕНЯ ВЕСНАВАЯ СЯЎБА ПАВІННА БЫЦЬ ЦАЛКАМ СКОНЧАНА. МТС ПАВІННЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ГЭТАЙ БАЯВОЙ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ І ЎРАДУ.

Бурныя дэманстрацыі супроць расстрэлу рабочых у Швэцыі

СТАКГОЛЬМ. Расстрэл забастаўшых рабочых у Марме, Аделенскай акругі, выклікаў бурны рух пратэсту ва ўсёй Швэцыі. Высунуты камуністычнай партыяй Швэцыі баявы пёзунг усеагульнай забастоўкі знайшоў жывы водгук ва ўсіх рабочых цэнтрах, у асабліваасьці у Норляндзе, Хэрнезане і Орнскельдсвіку, дзе работа на ўсіх прадпрыемствах спынена, а таксама ў цэнтрах цэлюлёзнай прамысловасьці — Гёзвундзе, Сандарне і інш. У Стакгольме выбухнула забастоўка салідарнасьці на машынабудаўнічых фабрыках, вэрфях і сярод будаўнічых рабочых. Камуністычная партыя арганізуе на заводах і фабрыках мітынгі пратэсту. Рабочыя паслалі некалькі дэлегацый да прэм'ера Экмана з патрабаваньнем неадкладна вывесьці войска з Аделенскай акругі.

16 мая вечарам камуністычная партыя і рэвалюцыйныя прафсаюзы арганізавалі ў Стакгольме дэманстрацыю пратэсту.

Цэнтральны камітэт Швэдзкай камуністычнай партыі зьвярнуўся з адозвай да швэдзкіх рабочых, у якой патрабуе пашырэньня ўсеагульнай забастоўкі ў Аделенскай акрузе і правядзеньне масавых дэманстрацый за вывад войска і штрэйкбрэхэраў і заклінае адказнасьць за крывавыя расстрэлы.

60-тысячная дэманстрацыя ў Стакгольме

СТАКГОЛЬМ, 16. Вечарам стакгольмскія прафсаюзы арганізавалі дэманстрацыю пратэсту супроць расстрэлу баставючых у Марме. У дэманстрацыі прымала ўдзел 60.000 чал.

Увечары адбыліся шматлюдныя мітынгі, на якіх выступалі камуністычныя прамоўцы. Дэманстрацыі і мітынгі суправаджаліся шматлікімі нападамі паліцыі. Паранена шмат дэманстрантаў.

СТАКГОЛЬМ, 15. Паводле паведамленьня друку рабочыя закідалі каменьнямі цягнік, які перавозіў войска і кулямёты ў раён забастоўкі ў Аделенскую акругу. Баставючыя, загарадзіўшы шлях, прымусілі цягнік спыніцца. Са Стакгольму ў Аделенскую акругу ночу выйшаў контрмінаносец. (ТАСС).

Забастоўка 12 тысяч рабочых у Сундсвале

СТАКГОЛЬМ. Як падае тэлеграфнае агенцтва, у акрузе Сундсваль абвешчана забастоўка 12 тысяч рабочых. Баставючыя заявілі, што яны ня выйдуць на працу да таго часу, пакуль прадпрымцы чых рабочых акругі Адален.

Гішпанскія Цэргібэлі расстрэльваюць рабочых-камуністаў

ПАРЫЖ, 17. «Юманіте» паведамляе, што паводле атрыманых вестак у Малазе, дзе абвешчан стан аблогі, пакараны сьмерцю бяз суда 2 рабочыя-камуністы.

Як падае агенцтва Гавас, у Грэнадзе арыштаваны 4 удзельнікі падпалу манастыра. Арыштаваныя перадаюцца ваеннаму суду.

Распачлівае становішча пацярпеўшых ад паводкі ў Заходняй Беларусі

АКУПАНТЫ АДНАЎЛЯЮЦЬ МАСТЫ НА ВАЕННА-СТРАТЭГІЧНЫХ ДАРОГАХ,— А ТЫСЯЧЫ СЕМ'ЯЎ ГІНУЦЬ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

Да ўсіх рабочых, працоўных сялян Заходняй Беларусі!

Таварышы!

СТЫХІЯ ПАВОДКІ З УСЁЙ СІЛАЙ НАВАЛІЛАСЯ НА ЎСЕ ВАЯВОДЗТВЫ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Ад паводкі пацярпелі перад усім дзесяткі тысяч рабочых, сялянскіх сем'яў і сем'і гарадзкой і местачковай беднаты.

Паводкай былі заліты частка Вільні і, перад усім, яе рабочыя кварталы і вуліцы (Антаколь, Лукіская вуліца, Тарткі, Фабрычная вуліца, Зажэчная, Полацкая і г. д.). Былі заліты вадой Слонім, Дзісна, Друя, мястэчка Казяны і інш. Пацярпелі ад паводкі Сьвянцянскі, Маладэчанскі, Ашмянскі, Віленска-Троцкі, Навагрудзкі, Валожынскі, Гарадзенскі, Стаўпецкі і іншыя паветы.

ДЗЕСЯТКІ ТЫСЯЧ сем'яў засталіся бяз прытулку. У адной толькі Дзісьне пацярпела ад паводкі каля 9 ТЫСЯЧ ЖЫХАРОЎ. У Вільні пацярпела ад воднай стыхіі некалькі тысяч сем'яў рабочых і гарадзкой беднаты. У Друі 600 сем'яў пацярпела ад паводкі.

Паводка сапсавала дзесяткі тысяч гэктараў азімых пасеваў на сялянскіх палёх. Водная стыхія зьнесла тысячы сялянскіх будынкаў—па афіцыяльных даных у Віленскім ваяводзтве зьнесена 2.738 будынкаў. САПРАЎДНАСЬЦЬ ЗНАЧНА ПЕРАВЫШАЕ ГЭТЫЯ ЎРАДАВЫЯ ЛІЧБЫ.

Насельніцтва гэтых паветаў, мястэчак і гарадоў — галадуе, ня маючы ніякіх сродкаў да жыцьця. Дзеці пацярпеўшых адданы на галодную сьмерць. У Віленскім і Навагрудзкім ваяводзтвах зьявілася ў масавых разьмерах эпідэмія — брушны тыфус.

ТАВАРЫШЫ!

Што-ж зрабіў, што прадпрыняў фашысцкі ўрад голаду, тэрору і вайны для таго, каб арганізаваць шырокую дапамогу дзесяткам тысяч рабочых і сялянскіх сем'яў, гарадзкой і местачковай беднаты, пацярпеўшым ад паводкі?

УРАД ФАШЫСЦКАЙ ДЫКТАТУРЫ НІЯКАЙ РЭАЛЬНАЙ АРГАНІЗАВАНАЙ І ШЫРОКАЙ ДАПАМОГІ ПАЦЯРПЕЎШЫМ АД ПАВОДКІ НЕ ДАЕ.

Міністар працы і сацыяльнага забясьпячэньня Губіцкі, які прыяжджаў у Вільню, заявіў, што «разьмеры дзяржаўнай дапамогі будуць устаноўлены ТОЛЬКІ ПАСЬЛЯ ГРУНТОЎНАГА ВЫВУЧЭНЬНЯ разьмераў страт, нанесеных паводкай». Урад зьбіраецца толькі «вывучаць» разьмеры страт, а тым часам, галадуюць, бяз прытулку і бяз хлеба знаходзяцца дзесяткі і дзесяткі тысяч працоўнага насельніцтва, а тым часам размытыя сялянскія палі, стаяць незасеянымі, бо галодныя і эрыўнаваныя сяляне ня маюць насеньня.

А адначасова з гэтым былы віленскі ваявода, а цяпер маршалак фашысцкага сэйму Рачкевіч адкрыта заявіў у Варшаве, што ўрад «НЯ ЗМОЖА ДАЦЬ ЗНАЧНАЙ ДАПАМОГІ» ПАЦЯРПЕЎШЫМ АД ПАВОДКІ.

Таварышы! Ужо тры гады Віленскае і Навагрудзкае ваяводзтвы церпяць, у ўрадзкі [illegible] і небольш пагоршае і без таго нязносна цяжкае становішча сялянскіх мас. А ўрад нават і не зьбіраецца аб тым, каб даць насеньне збожжа для пасеву шматлікім сялянскім раёнам, чые палі зьнішчаны паводкай.

Фашысцкія акупанты маюць сродкі на ліхаманкавую падрыхтоўку вайны супроць СССР. СОТНІ МІЛЬЁНАЎ І МІЛЬЯРДЫ ЗЛОТЫХ ВЫДАЮЦЦА НА ВАЕННЫЯ ПАТРЭБЫ, НА ЎТРЫМАНЬНЕ ПАЛІЦЫІ, ДЗФЭНЗЫВЫ І ВАСТРОГАЎ. Акупанты ўзяліся адразу-ж папраўляць сапсаваныя паводкай масты НА ВАЕННА-СТРАТЭГІЧНЫХ ШАСЭЙНЫХ, ЧЫГУНАЧНЫХ І ГРУНТАВЫХ ДАРОГАХ: Але для галодных мас працоўных, для зруйнаваных паводкай рабочых, сялян, гарадзкой і местачковай беднаты ўрад ня хоча даць і не дае ніякіх сродкаў, ніякай дапамогі.

Таварышы! Фашысцкі ўрад усё больш узмацняе падатковае ярмо, выціскаючы з мільёнаў працоўных апошнія соні на патрэбы ваеннай падрыхтоўкі. Урад ня толькі ня думае выдаваць ад падаткаў, плацяжу надоімак і ўсялякіх іншых абавязкаў гападаючыя і пацярпеўшыя ад паводкі паветы і ваяводзтвы Зах. Беларусі, але, наадварот, працягвае і будзе працягваць сваю палітыку падатковага ўціску, ПЕРАКЛАДАЮЧЫ ЎСЕ ЯГО ЦЯЖАРЫ НА ПЛЕЧЫ ПРАЦОЎНЫХ.

Таварышы! Паасобныя раёны Савецкай Беларусі таксама пацярпелі ад паводкі. Але там, у краіне прапетарскай дыктатуры, савецкі рабоча-сялянскі ўрад НЕАДКЛАДНА ПРЫШОЎ З АРГАНІЗАВАНАЙ І ШЫРОКАЙ ДАПАМОГАЙ УСІМ ПАЦЯРПЕЎШЫМ АД ВОДНАЙ СТЫХІІ. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі асыгнавалі ўсе неабходныя сродкі для пацярпеўшых, для арганізацыі грамадзкага харчаваньня, для спэцыяльнай дапамогі дзецям пацярпеўшых, выдана неабходная колькасьць ЛЕСУ І ЛЯСНЫХ МАТАР'ЯЛАЎ БЯСПЛАТНА, а для пасеву сапсаваных азімых палёў калгасным і бядняцка-сераднядкім гаспадаркам выдана 493.750 пудоў насеньня.

Ні аднаго незаселенага гэктара зямлі, ні аднаго неадбудаванага будынку ня будзе ў Савецкай Беларусі.

ГЭТА МАГЧЫМА ТОЛЬКІ Ў КРАІНЕ САВЕТАЎ, ГЭТА МАГЧЫМА ТОЛЬКІ ТАМУ, ШТО ТАМ НА ЧАЛЕ ЎЛАДЫ ЗНАХОДЗЯЦЦА САМІ ПРАЦОЎНЫЯ, ЯКІМІ КІРУЕ БАЛЬШАВІЦКАЯ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ.

Прэч фашысцкі ўрад голаду, тэрору і вайны!

Няхай жыве Савецкі Саюз і Савецкая Беларусь!

Прэч падрыхтоўку да вайны супроць сацыялістычнай бацькаўшчыны ўсіх працоўных!

Усе—да масавых рэвалюцыйных выступленьняў за свае пільныя патрэбы!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Бандыты абвастраюць тэрор у турмах

ВАРШАВА. У прагрымеўшай на ўвесь сьвет сваімі сярэднявяковымі катаваньнямі Луцкай турме абвешчана галадоўка. Галадаюць салідарна ўсе 300 палітзьняволеных у знак пратэсту супроць выключнага нават у польскіх умовах турэмнага рэжыму. У апошні час аноў абвастрыліся збойствы палітзьняволеных. У турме знаходзіцца, напрыклад, рабочы, які сядзіць ужо 2 гады, і да яго да гэтага часу ні разу не зьявіўся судовы сьледчы. Тэрарызуюцца сваякі, якія прыносяць яду зьняволеным. Палітзьняволеныя высунулі наступныя патрабаваньні: пакараньне судовага сьледзтва, спыненьне збойстваў зьняволеных, ануляваньне пратаколаў сьледзтва ў адносінах да тых зьняволеных, якія далі свае паказаньні пад катаваньнямі.

...ОРДЭН ЛЕНІНА І ЧЫРВОНАГА ПРАЦОЎНАГА СЬЦЯГУ--

гэроям сацыялістычнага будаўніцтва

Пастанова прэзыдыуму ЦВК СССР

МАСКВА. Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага камітэту Саюзу ССР пастанавіў:

за асобна-выдатныя заслугі ў галіне палапшэньня работы чыгуначнага транспарту ўзнагародзіць ордэнам Леніна: т. т. Матросава — вынаходцу, тэхніка НКШЗ, Андрыянава — вынаходцу - інжынэра НКПС. Канько — ударніка мацыяніста дэпо Ільліча МБВ чыгункі, Мішына — ударніка, арцельнага старасты станцыі і Ясінаватая, Паўлава — ударніка інструктара на аўта-тармазох Кастырчніцкай чыгункі, Прыходько — ударніка, сьлесара дэпо станцыі Днепятроўск, Кацярынінскай чыгункі, Цыунэль — ударніка токара дэпо станцыі Ясінаватая, Кацяр. чыгун., Васіленка — ударніка, мацыяніста дэпо ст. Зіма, Томскай чыг.

За самаадданую работу, праяўленую ў галіне палапшэньня транспарту, узнагародзіць ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу: Нясвадзьба — ударніка мацыяніста дэпо Ворша, МБВ чы., Ходыраева — ударніка, мацыяніста дэпо станцыі Коканд, Сярэдня Азіяцкай чыг., Шчаглова — ударніка, дарожнага майстра станцыі Асінаватая, Кацяр. чыгункі, Мабчэнка — ударніка, мацыяніка паравозника майстра дэпо станцыі Бежгарад, Паўднёвых чыгунак.

За асоба-выдатныя заслугі ў галіне прамысловага вынаходзтва, унясеньне рацыяналізатарскіх прапаноў, палепшэньне прадукцыі заводаў, арганізацыю Ударных брыгад, якія садзейнічаюць пасьпяховаму разьвіцьцю сацыялістычнай гаспадаркі, узнагародзіць ордэнам Леніна т. т. Бакуліна — ударніка, цямочніка цэхавога майстра заводу імя Лейтэната Шмідта, Осіпава — брыгадзіра, рабочага заводу АМО, Бунціна — вынаходцу — ударніка, рабочага фабрыкі «Дзяржзнак» — Антаньева — ударніка - брыгадзіра балотнай станцыі заводу № 24, Белава — ударніка сьлесара Першамайскага завода вагонтросту, Марнуласва — ударніка фармаўшчыка Першамайскага завода вагонтрэсту, Разьнікава — ударніка майстра мартэнаўскага цэху Макеўскага мэталюргічнага заводу.

За праяўленае выключнага гэройства прымупэньні пажару мына ўзнагародзіць орденам Леніна: Жадрева — ударніка механіка дзяржмыцыну № 1 (Растоў на Доне), Пчэлінава — ударніка памочніка механіка дзяржмыцыну № 1 (Растоў на Доне).

За самаадданую работу ў галіне прамысловага вынаходзтва, унясеньня рацыяналізатарскіх прапаноў, павышэньня прадукцыі, арганізацыі ўдарных брыгад, якія садзейнічаюць пасьпяховаму разьвіцьцю сацыялістычнай гаспадаркі, узнагародзіць ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу: Арсеньева — ударніка, майстра пракатнай майстэрні заводу № 1, Курскага — ударніка — заг. мэдычнымі пэхамі заводу № 1, Рыкава — ударніка брыгадзіра, рабочага заводу «Сварз», Паўлава — ударніка, загадчыка пракатнага цэху Амутнінскага мэталюргічнага заводу (Ніж. Край), Паваліева — арганізатара ударнай брыгады, сьвідравальшчыка мэханічнага цэху заводу АМО.

За асоба-выдатныя заслугі ў галіне арганізацыі калгасаў і правядзеньня палітычных кампаній на селе узнагародзіць ордэнам Леніна: Дзянісава — калгасьніка сяла Заган, Мухарынскага раёну, Бурацка-Мангольскай АССР.

Ударнік-чыгуначнік тав. Нясвадзьба

узнагароджаны ордэнам працоўнага чырвонага сьцягу



Нясвадзьба Аляксандар Антонавіч — 79-гадовы стары, выглядае маладзей сваіх фактычна пражытых гадоў. Нарадзіўся ў Чэхіі ў 1852 годзе, у сям'і рабочага. Асьвету мае ніжэйшую, скончыў рамесьніцкую школу. Прыехаў з Чэхіі ў 1872 годзе, пачаў працаваць у менскіх майстэрнях чыгункі сьлесарам, устанаўляючы першыя варштаты для дэпо чыгункі Смаленск-Берасьце.

З 1884 г. быў пераведзен у дэпо Ярсава памочнікам мацыяніста. У 1880 г. атрымаў права кіраваньня паравозам. З 1893 г. быў залічан маньўровым мацыяністам дэпо Смаленск. У 1896 г. пераведзен чыгуначным мацыяністам (дягніковым) дэпо г. Вязьмы. З 1905 г. працуе ў Ворша мацыяністам.

У 1927 годзе атрымаў падзяку ад кіраўніцтва МБВ чыг. за 55-гадовую добрасумленную работу на чыгунцы.

Зараз працуе ў якасьці маньўровага мацыяніста на ст. Ворша.

— Калі толькі сілы дазволяць — абавязкова скончу пяцігодку і дапамагу выканаць яе на транспарце за тры гады,—залуляе Аляксандар Антонавіч.

— Які прымае ўдзел у грамадзкай рабоце?

— Гады, сыночкі, шмат не дазваляюць. Але наведваю агульныя сходы, цікаўлюся працай вытворчых нарад і хоць для маньўраў адміністрацыя дае кепскія паравозы, але я іх люблю і ацэньваю больш, як за сабой, бо [illegible] на чыгунцы.

Паводле слоў таварышоў, з якіх Аляксандру Антонавічу прыходзіцца працаваць, ён зьяўляецца нельмі [illegible] рым таварышом і вопытным машыністам, ніколі не спазьняецца на працу, па першым патрабаваньні гатоў сесьці на паравоз.

Л. [illegible]

Рашучы адпор эксплёататарам

125.000 тэкстыльшыкаў Францыі распачалі забастоўку

ПАРЫЖ, 17. Тэкстыльны канцэрн у Рудзе (цэнтр тэкстыльнай прамысловасьці дэпартаменту Поўначы) пачаў наступленьне на заработную плату рабочых са скасаваньня прэміі, устаноўленай у разьмеры ад 3-х да 4-х процантаў заработку ў 1930 годзе.

Пастанова канцэрну выклікала моцнае абурэньне сярод рабочых. Настрой рабочых настолькі рашучы, што нават рэфармісцкія прафсаюзы вымушаны былі адхіліць новыя ўмовы прадпрымальцаў і выказацца за ўсеагульную забастоўку, якая павінна пачацца 18 мая. 1 вхоліць 125.000 тэкстыльшыкаў.

Як паведамляе «Юманіте», цэнтральны камітэт барацьбы і унітарны прафсаюз тэкстыльшыкаў пастанавілі пачаць усеагульную забастоўку і стварыць на прадпрыемствах забастовачныя камітэты.

Мерапрыемствы для пашырэньня пасеву ільну і канапель у веснавую пасеўную кампанію 1931 г.

Пастанова Савету Народных Камісараў і Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

1931 год зьяўляецца годам заканчэньня пабудаваньня падмурку сацыялістычнай эканомікі. Гэта задача сусьветна - гістарычнага значэньня патрабуе для свайго вырашэньня мабілізацыі ўсіх сіл, актыўнасьці і самадзейнасьці рабочае клясы, шырокіх мас калгаснікаў і аднаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарак пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі.

Найбольш важнаю прадпасылкаю для пасьпяховага ажыцьцяўленьня баявых задач бягучага году зьяўляецца сапраўды бальшавіцкае правядзеньне і выкананьне пляну веснавой пасеўнай кампаніі.

Пастаўленая партыяй задача аб вырашэньні праблемы тэхнічных культур і жывёлагадоўлі на базе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ўскладае на савецкія і партыйныя арганізацыі, рабочых, калгаснікаў і бядняцка-сераднякіную частку вёскі асабліва адказныя перад краінаю абавязкі.

БССР, зьяўляючыся часткаю ільнаводчай базы Саюзу ССР, павінна правесьці веснавую пасеўную кампанію 1931 г. так, каб максымальна быў пашыран пасеў ільну і канапель і каб поўнасьцю былі выкананы дырэктывы партыі і ўраду аб пашырэньні пасеўных плошчаў ільну з 150 тыс. га да 240 тыс. га і канапель з 21.961 га да 40.000 га.

Пасьпяховае выкананьне пляну пашырэньня пасеву і своечасовай апрацоўкі ільну і канапель абумоўліваецца тым, што ў 1931 годзе ў БССР арганізуюцца 30 машына-трактарных станцый, завозіцца 500 ільнацерабілак, будуюцца 43 новыя і заканчваецца будаўніцтва 2 заводаў для першапачатковай апрацоўкі ільну, апрача існуючых у 1931 г. 2-х заводаў і 3-х новых заводаў для апрацоўкі канапель, якіх да гэтага часу ў БССР зусім ня было. Гэтыя заводы змогуць пераапрацаваць каля 45 проц. усяго валавога збору ільняной і каля 28 проц. усёй канапляной саломы.

Выкананьне гэтага пляну залежыць, галоўным чынам, ад таго, як цэнтральныя і раённыя арганізацыі змогуць пабальшавіцку кіраваць сяўбою, як яны змогуць мабілізаваць актыўнасьць партыйных, савецкіх і прафсаюзных мас і як яны змогуць арганізаваць самога пасеўшчыка-калгасніка, аднаасобніка і рабочых саўгасаў.

Для пашырэньня пасеву ільну і канапель, павялічэньня ўраджайнасьці і поўнага правядзеньня кантрактацыі, і поўнага правядзеньня пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б лічаць патрэбнымі правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. Для заахвочэньня пасеўшчыкаў ільну і канапель да пашырэньня пасеваў устанавіць наступныя ільготы і перавагі калгасам і аднаасобным бядняцка-сераднякіным гаспадаркам, якія поўнасьцю выканаюць вытворчае заданьне па ільне і канаплях:

а) не абкладаць адзіным сельска-гаспадарчым падаткам плошчы пад тэхнічнымі культурамі на землях новых раскарчовак, расчыстак і разводак;

б) даходы ад пасеваў ільну і канапель абкладаць адзіным сельска-гаспадарчым падаткам з палавіннаю скідкаю ў параўнаньні са збожжавымі культурамі;

в) для калгасаў, якія поўнасьцю выканаюць вытворчае заданьне па пасеве, уборцы ільну і канапель, і плян загатовак ільну і канапель—устанавіць скідку з адзінага с.-г. падатку ў 10 проц.;

г) вызваліць ад здачы збожжа па цэнтралізаваных загатоўках з ураджаю 1931 г. тыя калгасы і аднаасобныя бядняцка-сераднякіця гаспадаркі, якія паводле пастановы СНК БССР ад 2 сакавіка 1931 г.—«пра ўстанаўленьне для ільнаканапляводчых раёнаў процанту пасеваў ільну і канапель, пры выкананьні якога ў калгасах і ў аднаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарках не праводзіцца кантрактацыя збожжа ўраджаю 1931 году» (газэта «Сав. Бел.», № 53)—пасеюць ня менш вызначанага па раёне процанту ільну і канапель і выканаюць заданьні ільну і канапель у чацьвертым квартале 1931 году.

2. Абавязаць Наркамснаб забясьпечыць хлебам кантрактантаў ільну і канапель па нормах (за адзін цэнтнар валакна — 1,25 цэнт. хлеба) з такім разьлікам, каб не пазьней 20 мая было выдана аванс калгаснікам 0,6 цэнтн. хлеба і аднаасобнікам—0,4 цэнтн. хлеба за закантрактаваны гэктар ільну і канапель.

3. Дадаткова забясьпечыць тыя гаспадаркі, якія поўнасьцю выканаюць вытворчае заданьне па пашырэньні пасеву ільну і канапель, прамысловымі таварамі ў наступных разьмерах:

а) на 25 руб. за кожны новы гэктар пасеву ільну і на 35 руб. за кожны новы гэктар пасеву канапель—калгасныя гаспадаркі;

б) на 5 руб. за кожны новы гэктар пасеву ільну і канапель—савецкія гаспадаркі для дадатковага забясьпечэньня рабочых гэтых саўгасаў;

в) на 10 руб. за кожны новы гэктар пасеву ільну і на 15 руб. за кожны новы гэктар пасеву канапель аднаасобныя бядняцка-сераднякіця гаспадаркі;

г) тыя аднаасобныя гаспадаркі, якія калектыўна пасеюць на агульным масыве лён і канаплі, дадатковa забясьпечваюцца прамысловымі таварамі на 15 руб. за кожны гэктар ільну і на 20 руб. за кожны гэктар канапель.

Абавязаць Наркамснаб і Белкаапсаюз не пазьней 20 мая стварыць таварны праміяльны фонд на суму 2.445 тыс. руб. (мануфактурэй, мылам, скуратаварамі, галантарэяй, трыкатажам, абуткам) для дадатковага забясьпечэньня прамысловымі таварамі пасеўшчыкаў ільну і канапель.

4. Давесьці процант пасеву ільну і канапель у саўгасах Ільнаканапляводтрэсту ня менш, як да 50 проц., у калгасах раёнаў дзейнасьці МТС ня менш, як 30 проц., ва ўсіх ільнаводных калгасах ільнаводчых раёнаў ня менш, як да 25 проц. і ва ўсіх іншых саўгасах і калгасах захаваць процант пасеву ільну і канапель ня менш мінулага году.

5. Правесьці пасеў ільну і канапель на наступных землях:

а) на зяблеве, на паднятых канюшынішчах, на землях з-пад бабовых і прапашных культур (гарох, віка, бульба, кораньплоды і інш.), а таксама на ўзараных прыгодных цалінных землях і на раскарчаваных падлесных плошчах са зьвязанымі глебамі;

б) на папары (у гэтым выпадку) правесьці раньні пасеў ільну і канапель на валакно;

в) у ільнаводных саўгасах і калгасах арганізаваць лугавыя севазвароты, якія не патрабуюць гною для пасеву ільну і канапель;

д) засяваць канаплі на асушаных пры

ВЫВОДЗІЦЬ НА ЧЫСТУЮ ВАДУ ЗАСІМАВЫХ,

змагацца з найбольш небясьпечным—вялікадзяржаўным шавінізмам

Біць да зьнішчэньня, да хрусту касьцей па шавінізмах ўсялякіх масьцей!

Ці вялікадзяржаўная храпа запенена

Ці морда нацдэма па-воўчу аскалена

Агонь па вялікадзяржаўніцтве

Ва ўсіх кутках Савецкага Саюзу ідзе напружаная сацыялістычная будоўля.

Бальшэвіцкія тэмпы ў прамысловасьці вырашылі пытаньне—«хто кого» канчаткова на карысьць сацыялізму.

На грунце сацыялістычнай рэканструкцыі каранным чынам зьмяняецца твар вёскі, адыходзіць у мінулае дзедаўскі, дробнаўласьніцкі ўкład.

На аснове суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца кулацтва як кляса.

Клясавы-варожыя элементы, дажываючы апошнія гадзіны, разьвіваюць шалёную дзейнасьць. Яны ў самых нахабных, зьвярыных, у самых утончаных формах адкрыта і замаскавана імкнуцца «ўхапіць гісторыю за пятку», затрымаць варожы рух сацыялізму, для таго, каб адтэрміноваць сваю гібель.

У гэтай рашаючай і канчатковай клясавай бойцы вораг на цураецца ніякай вопратки; ён імкнецца выкарыстаць усякую магчымасьць для таго, каб перашкодзіць шчыліну на любым з вучасткаў нашай работы.

Ідэалёгічны фронт—гэта адзін з важнейшых вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва. Таму і на ім мы маем даволі ВЫРАЗНАЕ адлюстраваньне агульнага абвастрэньня клясавай барацьбы.

Па меры ўзмацненьня агульнага наступленьня сацыялізму, па меры ўзмацненьня работы ў галіне будаўніцтва нацыянальнай пралетарскай культуры яшчэ больш актывізуюцца варожыя элементы, у тым ліку і шавінізмы ўсіх масьцей і адценьняў.

Цэлы рад фактаў, якія мелі свае асьвятленьне на старонках «Зьвязды», з асаблівай відавочнасьцю сьцьвярджаюць наяўнасьць актывізацыі ўсіх шавінізмаў і асабліва вялікадзяржаўнага, што становіць сабою галоўную небясьпеку на даным этапе.

«Вялікадзяржаўны шавінізм знаходзіць сваё выяўленьне ў адмаўленьні беларускай нацыі, у адмаўленьні беларускай мовы, у пагардлівых эдкосінах да мовы».

Гэта рыса вялікадзяржаўнага шавінізму, падкрэсьленая Кастрычніцкім пленумам ЦК КП(б)Б, знайшла сваё надзвычай выразнае адлюстраваньне ў ідэалёгіі махровага шавініста ЧУДЗІНА.

Зусім зразумела, што імкненьні вялікадзяржаўных шавіністаў—гэта ІМКНЕНЬНІ КЛЯСАВЫХ ВОРАГАЎ. Яны (гэтыя імкненьні накіраваны супроць нацыянальнай палітыкі партыі і яе сутаўных частак, як беларусізацыя—каранізацыя апарату, школ, прэсы і інш.

Відавочна, што вялікадзяржаўныя шавіністы выступаюць і дзейнічаюць якраз супроць тых мерапрыемстваў партыі, якія ўзмацняюць выхаваньне працоўных мас у інтэрнацыянальным духу, якія садзейнічаюць найбольш шырокаму далучэньню працоўных мас усіх нацыянальнасьцяй да непасрэднага і актыўнага ўдзелу ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве краіны.

Маскуючыся іншы раз інтэрнацыяналістам, вялікадзяржаўнік з пенай на вуснах хоча даказаць, што «беларуская нацыі фактычна няма», што беларуская мова—«дылетант», і гатым мніным «інтэрнацыяналістычным» сьцягам «прыкрывае імкненьне аджываючых кляс пераваўшай раней вялікарасійскай нацыі вярнуць сабе страчаныя раней прывілеі» (з пастановы XVI зьезду УсеКП(б).

У ролі такога абаронцы «единой и неделимой» выступіла «настаўніца» ЗАСІМАВА, падаючы заяву ў райКК-РСІ.

«Працоўнае насельніцтва Беларусі да Кастрычніцкага перавароту ў сваёй масе было наогул няпісьменнае і беларуская мова прасьледавалася,—у гэтых умовах вялікадзяржаўны шавінізм мае асабліва спрыяючую глебу для свайго існаваньня» (Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б).

Вось гэту «спрыяючую глебу» і хацела выкарыстаць заўзятая шавіністка—настаўніца ЗАСІМАВА ў мэтах разьвіцьця нацыянальнай варожасьці, у мэтах разбураньня калгасаў.

Ідэалёгія ЗАСІМАВАЙ, што выявілася ў заяве райКК-РСІ, з усёй паўнатой паказвае КЛЯСАВУЮ ПРАЎДУ, ДА КАНЦА ВАРОЖУЮ СУТНАСЬЦЬ ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНІЦКІХ ІДЭЯ.

Зусім невыпадковым зьяўляецца тое, што справа завязалася на грунце будаўніцтва калгасу. Зусім невыпадкова тое, што Засімава—кулацкі дарадца.

На гэтым канкрэтным факце лішні раз ілюструюцца сапраўдныя АНТЫКАЛГАСНЫЯ, АНТЫСАВЕЦКІЯ НАМЕРЫ ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНІКАЎ. На гэтым канкрэтным факце, як на паверхні люстра відаць АДЗІНАСЬЦЬ ІДЭАЛЁГІІ, КЛЯСАВЫХ ІМКНЕНЬНЯЎ і вялікадзяржаўнікаў і беларускіх нацыяналдэмакратаў і іншых шавіністаў, якія ў адналкава ступені скалаць зубы супроць калектывізацыі, абараняюць кулака і надзвычай дружна дзейнічаюць у інтэрвэнцыяністкіх мэтах.

Праводзячы сваю варожую дзейнасьць, ЗАСІМАВА ўзводзіць панклёпы на нацыянальную палітыку партыі, на саветы. Стаўшы ў позу абаронцы «великоруссов», яна бездапаможна імкнецца даказаць, што «в райисполкоме нет представителя от русских».

Якой нікчэмнасьцю гучаць гэтыя патугі кулацкага адваката ў параўнаньні з сапраўднасьцю.

Паводле вынікаў апошніх перавыбараў саветаў у складзе райвыканкомаў разам з беларусамі і дэпутатамі іншых нацыянальнасьцяй ёсьць 5,8 проц. расійцаў; у складзе гарадзкіх саветаў расійцаў 11 проц.

Сутнасьць гэтага пырсканьня вялікадзяржаўніцкай пенай заключаецца ў тым, што людзям тыпу Засімавай хацелася-б бачыць ва ўрадавых органах не пралетараў, не працоўных, а кулака і ўсіх тых, хто асуджан на гібель, хто выкінут Кастрычнікам на сьметнік гісторыі.

Для таго, каб пасьпяхова разгортваць работу па ўсіх вучастках будаўніцтва і ў прыватнасьці ў галіне будаўніцтва нацыянальнай пралетарскай культуры, трэба з усёй рашучасьцю і сілай змагацца супроць усіх шавінізмаў і ў першую чаргу супроць вялікадзяржаўнага шавінізму—галоўнай небясьпекі.

ПАРТЫЯ ЗАХОЎВАЕ І БУДЗЕ ЗАХОЎВАЦЬ ГЭТА ПАЛАЖЭНЬНЕ. ІМЕННА НА АСНОВЕ ТАКОЙ БАРАЦЬБЫ МЫ ЗАБЯСПЕЧЫМ ЯШЧЭ БОЛЬШЫЯ ПЕРАМОГІ ў галіне зьнішчэньня рэштак знаямічнай няроўнасьці, у справе будаўніцтва культуры, нацыянальнай на форме, і пралетарскай па зьмесьце.

Кулацкі дарадца—абаронца „единой и неделимой"

Клясавы вораг у змаганьні супроць пераможнага сацыялістычнага наступленьня ўжывае сваю тактыку. Кулак, шкоднік, вялікадзяржаўны расійскі шавініст, беларускі нацыянал-дэмакрат — уся гэта чорная зграя з лягеру клясавых ворагаў вельмі часта, видучы скрытае змаганьне супроць пралетарскай дыктатуры, нацягае на сябе вопратку «радетеля» і «актыўнага змагара» за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі. Клясавы вораг свае вылазкі супроць нацыянальнай палітыкі партыі і ўраду заўсёды прыкрывае спадручнай яму шырмай.

Так паступіла і махровая вялікадзяржаўная шавіністка **Засімава** пры сваёй нахабнай вылазцы супроць нацыянальнай палітыкі партыі і ўраду заўсёды Судаўніцтва. Засімава «дымавую заслону» для прыкрыцьця сваёй вялікадзяржаўнай шавіністычнай вылазкі знайшла ў наступных абставінах:

У вёсцы **Пархімкавіцкая Слабада** (Дваранцкі сельсавет, **Рагачоўскі раён**) большасьць насельніцтва-русскіе. Таму мясцовыя органы, ажыцьцяўляючы ленінскую нацпалітыку КП(б)Б, адкрылі там школу, якая працуе на расійскай мове. У 1929-30 навучальным годзе ў аднаго кулака была нанята хата пад школу. У пачатку-ж. 1930 г., калі бядняцка-сера пяцкія масы Пархімкавіцкай сяльсавету аб'ядналіся ў калгас, то [illegible] сядзіба кулака перайшла пад калектыў. У двары, дзе змяшчалася школа, стаяла калгасная жывёла і гэта... выклікала абурэньне ў Засімавай. Яна ўбачыла ў арганізацыі калгасу пагібель капіталістычных элементаў вёскі, убачыла, як сьцвярджае грані нацыянальнай розьніцы паміж беларусамі і расійцамі.

Вялікадзяржаўная шавіністка, асклёпыўшыся супроць нацыянальнай палітыкі КП(б)Б, **ва унісон з контр-рэвалюцыйнымі беларускімі нацыянал-дэмакратамі** стэрычна крычыць аб тым, што «нацпішасьцям не даюць магчымасьці «зьвівацца», аб тым, што «плянаў разьвіцьця нацменшасьцяй ажыцьцяўляюцца навыварат». У чым сутнасьць гэтай клясава-варожай лёгікі. Яна выклікана тым, што ў нас у краіне пралетарскай дыктатуры кіраўніком нацыянальна-культурнага будаўніцтва зьяўляецца камуністычная партыя — авангард рабочай клясы. Вялікадзяржаўная шавіністка Засімава хацела-б бачыць не такую школу, якою яна зьяўляецца ў нас, у Савецкім Саюзе, Засімава не хацела б бачыць калгасу, дзе згуртаваны бядняцка-серадняцкія масы ўсіх нацыянальнасьцяй. І яшчэ больш ненавісна для яе тое, што на чале калгасу стаіць беларус.

«Сам председатель колхоза—піша Засімава ў сваёй заяве райКК-РСІ—по национальности белорусс. Он является самым ярким и открытым представителем белорусского великодержавного шовинизма... Белорусский хохол под маской председателя национального колхоза поместил в нашей национальной школе своих детей. Видно, по программе белорусского шовинизма две белорусские свиньи, выброшенные на бобруйский рынок, ценятся дороже, чем две сотни неграмотных детей великоруссов».

Якія-ж факты падае Засімава ў пацьвярджэньне кінутага абвінавачаньня старшыні калгасу. Гэтых фактаў ні ў сваёй заяве, ні пры расьсьледваньні справы Засімава не падала. Такіх фактаў няма!

Які спрытны манэўр для распальваньня нацыянальнай варожасьці паміж насельніцтвам вёскі! Пархімкаўская Слабада, які спрытны манэўр для таго, каб патрабіць дзяцей — вучняў школы супроць нацыянальнай палітыкі партыі і супроць калгасу. І гэты свой манэўр вялікадзяржаўная шавіністка ўжывала вельмі шырока. Калі калгасьніца кармяла скаціну, што стаяла ў дварэ школы, вучні, натрауленыя «настаўніцай» супроць калгасу, выбягалі на двор і ўсімі сродкамі перашкаджалі калгасьніцы выконваць сваю работу. Сваю глыбокую нянавісьць да калгасу Засімава праяўляла ня толькі ў сваёй агідная дзейнасьці, будучы ў школе. Яна не адлюстравала і ў сваёй заяве. Наконт калгасу Засімава піша:

«Это не колхоз, а сборище белорусских хохлов, которые не умеют вести свое хозяйство, все время треплется один грязный хохол белорусского шовиниста, который, как собака, развалившаяся на сене, [illegible] и тебе не дам».

Засімава ня толькі не дапамагала калгасу, а, наадварот, імкнулася яго ўсямерна падарваць. І ў той час, калі ў калгасе не хапала рабочай сілы, Засімава хадзіла дапамагаць кулаком. Яна мела цесную сувязь з мясцовым кулацтвам, зьяўляючыся дарадцай у іх змаганьні супроць калгасу.

«Когда перед глазами всех—піша далей гэта заядлая шавіністка—было открыто, что национальная (русская) школа Дворецкого сельсовета представляет из себя каталажку для мёртвых преступников (падкрэсьлена мною—А. Г.), белорусский хохол, чтобы замазать глаза дуракам, старается очистить грязь со своей черной собачьей пысы і взвалить ее на невинные головы наших детей».

Якую хацела-б бачыць школу «настаўніца» Засімава—зразумела кожнаму. І тому зусім ясна, што для яе тая школа, дзе не пяецца гімн «боже царя храни», дзе не набіваюцца галавы дзяцей усякай трухлявай гнільлю, як «закон божий» і г. д., дзе вучні могуць навучацца на сваёй роднай мове,—такая школа па перакананьнях Засімавай «представляет из себя каталажку для мертвых преступников». Вось дзе вывернута да канца нутро заядлай вялікадзяржаўнай шавіністкі, якая, будучы ахвясьцем чорнасоценшчыны, па непаразуменьні трапіла на работу ў савецкую школу.

Гэта ня словаблудная оргія, якая выходзіць ад спарахнелага адкыўшага рэдкага экзэмпляра чорнасоценшчыны. Гэта прадуманы і ўзважаны крок заядлага клясавага ворага, які знайшоў для сябе эручны момант, каб выступіць супроць нацыянальнай палітыкі партыі, супроць калгаснага будаўніцтва.

Хто-ж такая Засімава? Даць аб сабе належныя весткі яна адмовілася. Аднак, тыя матар'ялы, якія мы маем, паказваюць, што яна ў 1916 годзе скончыла гімназію і да 1921 г. працавала недзе на Паваложжы ў дашкольных установах. У Беларусі, будучы ў Заполькай школе, яна на працягу ўсяго пэрыяду ігнаравала беларускую мову і, нарэшце, дабілася таго, што не паслалі ў расійскую школу, Дварецкага сельсавету. Характэрна паказаць яшчэ на такі момант. Засімава пры разгляде яе справы на пасяджэньні Рагачоўскай РСІ з пенай на губах абараняла наступны погляд:

«В БССР главный уклон в национ-литике — проявление белорусского шовинизма».

І калі яна была выкрыта да канца, яна ня прызнала памылак, не ўсьвядоміла, што сваёй заявай выступіла супроць палітыкі партыі. Наадварот, Засімава настойліва сьцьвярджала. «Нацменьшинствам не дают возможности развиваться! От русских нет ни одного представителя в райисполкоме! Господствует полнейшее гонение на русских!»

Гэта з усёй выразнасьцю паказвае, што Засімава пераконаны і заядлы клясавы вораг.

Вылазку Засімавай мы расцэньваем, як уступленьне ў пераклічку з вялікадзяржаўнымі шавіністам і сваім клясавым субратам Чудзіным.

Вылазкі і Чудзіна, і Засімавай выразна гавораць аб тым, што масы чырвонасьцяжнага настаўніцтва павінны павысіць сваю клясавую пільнасьць, настойліва выкрываць у сваіх радах агентуру варожых клясаў.

КП(б)Б, няўхільна ажыцьцяўляючы ленінскую нацпалітыку, в усёй бальшавіцкай непрымірымасьцю біла і будзе біць па ўсякіх вылазках вялікадзяржаўных расійскіх шавіністаў, па праяўленьнях контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавіністамі усіх колераў. КП(б)Б, а пад яе кіраўніцтвам самыя шырокія масы рабочых, калгаснікаў, беднаты і серадняку, самыя шырокія масы працоўнай інтэлігенцыі будуць весьці неаслабнае змаганьне за ажыцьцяўленьне плянаў вялікага і пераможнага сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце.

А. Г.

Краціва

ДЗЕ-Ж ЯНА, ГАЛОЎНАЯ САМАЯ

«Ці не прахлопаў гэта
вушамі я?
Чамусьці дагэтуль
нідзе не натрапіў,
Дзе-ж яна тая
галоўная самая,
Што на даным этапе?
Вадома —
ня стаў-бы я ёй спачуваць.
Не!
Рук, як Пілат той,
ня вымыю!
Ды толькі-ж агітацыі
нідзе ня чуваць
За «единую»
і «неделимую».
Так прысягаюцца,
б'юць сябе ў грудзі
(Гатовы бажыцца
разоў хоць па дваццаць)
Альбо і напраўду
наіўныя людзі,
Альбо што такімі
хочуць здавацца.
Ды хіба-ж яна гэтая
у чым вінавата?
За грамадзянкай Засімавай
няма аніякіх грахоў —
Папрабуй вазьмі
да яе прычапіся,
Калі не скрыўдзіў
«белорусский грязный хохол»,
Такая «собачья
черная пыса».
«Хохлы» прыгнятаюць,
тык як тут ня лаяцца?
А нацпалітыка ў БССР
ёй наогул... не падабаецца.
Праводзіцца нек —
галавою ды ўніз,
Цярпела дагэтуль,
бо больш няма сіл.
Так прыпякае
галоўны ўхіл —
«Белорусский великодержавный
шовинизм».
І вось шавіністку
мы бачым за працаю
З пенай на вуснах,
аблітую потам:
Яна, бачыце, абараняе
вялікарускую нацыю
Якая наогул у нас
«пад прыгнётам».
Моцна, як кажуць,
тут запрубована!
Каб гэтакай гадзіне
зубы
ды сіла,
Дык хіба-ж яна
ня ўкусіла?
Ды няшчасьце яе —
што бяз зубоў яна.
Пырскае сьліною,
грозіць нам згубаю
І давіцца ўласнаю злосьцю
бяззубаю.
Ды нам супроць вылазак
гэтакай гадзіны
Моцныя лёзунгі
партыяй дадзены:
Бі да зьнішчэньня,
да хрусту касьцей
Па шавінізьме
ўсякіх масьцей!
Ці вялікадзяржаўная
храпа запенена,
Ці морда нацдэма
па-воўчы аскалена
Бі па іх
вернаю зброяю
Леніна
І лепшага ленінца —
Сталіна!

«заварылася каша»
І заява яе
паўзе ў РКК
На беларускага працаўніка,
На старшыню калгасу.
Справа зусім тут
ня ў сутнасьці спрэчкі:
Чаму-ж і ня ўзяць
тую самую «шчэпку»,
За якую знаходзяць прычэпку?
Але вось паслухайце,
што за славечкі!
Славечкі—што трэба
Дый шматавата...
Ды хіба-ж яна тут
у чым вінавата?
За грамадзянкай Засімавай
няма аніякіх грахоў —
Папрабуй вазьмі
да яе прычапіся,
Калі не скрыўдзіў
«белорусский грязный хохол»,
Такая «собачья
черная пыса».
«Хохлы» прыгнятаюць,
тык як тут ня лаяцца?
А нацпалітыка ў БССР
ёй наогул... не падабаецца.
Праводзіцца нек —
галавою ды ўніз,
Цярпела дагэтуль,
бо больш няма сіл.
Так прыпякае
галоўны ўхіл —
«Белорусский великодержавный
шовинизм».
І вось шавіністку
мы бачым за працаю
З пенай на вуснах,
аблітую потам:
Яна, бачыце, абараняе
вялікарускую нацыю
Якая наогул у нас
«пад прыгнётам».
Моцна, як кажуць,
тут запрубована!
Каб гэтакай гадзіне
зубы
ды сіла,
Дык хіба-ж яна
ня ўкусіла?
Ды няшчасьце яе —
што бяз зубоў яна.
Пырскае сьліною,
грозіць нам згубаю
І давіцца ўласнаю злосьцю
бяззубаю.
Ды нам супроць вылазак
гэтакай гадзіны
Моцныя лёзунгі
партыяй дадзены:
Бі да зьнішчэньня,
да хрусту касьцей
Па шавінізьме
ўсякіх масьцей!
Ці вялікадзяржаўная
храпа запенена,
Ці морда нацдэма
па-воўчы аскалена
Бі па іх
вернаю зброяю
Леніна
І лепшага ленінца —
Сталіна!

Пакончыць з пагардлівымі адносінамі да беларусізацыі

Ня выконваюць сваіх-жа пастаноў

Бюро аршанскага РК КП(б)Б яшчэ ў студзені месяцы г. г. прызнала ход практычнага ажыцьцяўленьня пастановы кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б аб узмацненьні работы ў галіне беларусізацыі на Аршаншчыне нездавальняючым.

Здавалася, што практычныя прапановы гэтай рэзалюцыі павінны былі быць тэрмінова з бальшавіцкай рашучасьцю праведзены ў жыцьцё, але на справе [illegible] ня так. Дарэчы [illegible] райКК-РСІ і фракцыям прыцягненьні [illegible] вакцыі і работ[illegible]му, якія самі [illegible]чай і не пра[illegible] — ня вы[illegible]

[illegible] рнацы[illegible]ньне [illegible]е—ня [illegible] што [illegible]еньня [illegible]

[illegible] камбінаце [illegible] адказнымі [illegible]дкі, калі па[illegible]ай мове. Парт[illegible] работы ў гэтым [illegible] Спробы паасобных [illegible]арух у гэтай галіне [illegible] належнага падтры[illegible]

[illegible]шча і на Ільнакамбінаце, [illegible] на Белдрэсе і чыгуначным [illegible] паштовай канторы, дзе мно[illegible]працоўнікаў беларускай мовы [illegible]ць, у гурток па вывучэньні яе [illegible]ліся толькі 2 чалавекі.

За апошні час меў месца цэлы рад вылазак вялікадзяржаўных шавіністаў. Так, камсамолец Палявод, ячэйкі кандуктароў станцыі Ворпы, загадаў выкладчыку чытаць лекцыю грамадазнаўства на расійскай мове, але калі апошні не згадзіўся і гаварыў далей па-беларуску, дык Палявод дэманстрацыйна пакінуў лекцыю. — Усё роўна нічога не разумею — заявіў Палявод, пакідаючы аўдыторыю.

Бюро ячэйкі ЛКСМВ кандуктарскіх брыгад не зрабіла з гэтага ганебнага факту палітычных вываўдаў, прымірэнча аднесася да вялікадзяржаўніцкай вылазкі Паляўода. І толькі пасьля таго, як газета «Ленінскі прызыў» узьняла гэта пытаньне, бюро райкому выключыла Паляўода з камсамолу і абвясьціла суровую вымову бюро ячэйкі. Пры высьвятленьні гэтага факту выявіўся яшчэ цэлы рад падобных шавіністычных момантаў.

На курсах СП ст. Ворша, якія ўкамплектаваны выключна камсамольцамі, беларуская мова ня ўжывалася, большасьць выкладчыкаў адмаўлялася чытаць лекцыі па-беларуску.

Такіх фактаў можна прывесьці шмат, але і гэтых даволі для таго, каб патрабаваць ад райкому КП(б)Б у самым тэрміновым парадку праверыць выкананьне сваіх пастаноў. Неабходна найбольш мабілізаваць партыйныя масы на барацьбу супроць усякіх адхіленьняў ад лініі партыі ў нацыянальным пытаньні, за поўнае выкананьне пастаноў кастрычніцкага і красавіцкага пленумаў ЦК КП(б)Б.

А. Кустановіч.

Заводы, прафсаюзы! Арганізуйце вытворча-культурнае шэфства над торфзаводамі

САКРАТАРЫЯТ ЦСПСБ ПАДТРЫМЛІВАЕ ПРАПАНОВУ „ЗЬВЯЗДЫ"

ПЕРАВЫБАРЫ ТАРФЯНЫХ ПРАФКАМІТЭТАЎ СКАРЫСТАЦЬ ДЛЯ МАБІЛІЗАЦЫІ МАСЫ ТАРФЯНІКАЎ НА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЗДАБЫЧЫ ТОРФУ

Пастанова сакратарыяту ЦСПСБ аб практычнай дапамозе Саюзу рабочых торфасландавай прамысловасьці

Заслухаўшы паведамленьне ЦП саюзу рабочых торфа-сланцавай прамысловасьці аб пачатку торфасезону, сакратарыят ЦСПСБ адзначае:

Пастановы партыі і ўраду аб пачатку здабычы торфу з 5 мая — не рэалізаваны: да 10 мая пушчана ўсяго 23 машыны — 35 проц., што з першых-жа дзён стварае напружанасьць у выкананьні праграмы. Забясьпечанасьць рабочай сілай вызначаецца: па здабычы торфу 5.809 чал. — 100 проц., па сушцы і ўборцы торфу — 3.652—чал. — 56,5 проц. Рад торфазаводаў працяў выключную непадрыхтаванасьць і бездапазнасьць у падрыхтоўцы да пачатку работ па торфа-здабычы.

З боку Белторфу ня было забясьпечана апэрацыйна-гаспадарчае кіраўніцтва ў сэнсе падрыхтоўкі да пачатку сезону.

Пастанова ЦСПСБ аб мабілізацыі ў дапамогу саюзу торфа-сланцавай прамысловасьці 10 адказных прафработнікаў выконваецца недапушчальна марудна: усяго мабілізаваны два таварышы. Пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб уцягненьні ў торфа-прамысловасьць 1.000 камсамольцаў да гэтага часу не ажыцьцяўлена: ЦК ЛКСМБ абмежаваўся толькі разьвёрсткай па раёнах.

Сакратарыят ЦСПСБ пастанаўляе:

1. Пацьвердзіць пастанову ЦП саюзу торфа-сланцавай прамысловасьці аб прыцягненьні да адказнасьці дырэктара і тэхнарука торфазаводу «Шлях сацыялізму» за зрыў пачатку сезону, а таксама дырэктароў торфазаводаў «Капектыўная праца» і «Міхановічы» за самаўласнае пакіданьне вытворчасьці.

Даручыць сэктару масавай работы ЦСПСБ, разам з ЦП саюзу торфа-сланцавай прамысловасьці, прыняць захады да выяўленьня канкрэтных вінаватых у зрыве прамфінпляну.

2. Абавязаць Белторф пад адказнасьць т. Арндта ў 3-хдзённы тэрмін вылучыць і прымацаваць да адстаючых заводаў ня менш 8 адказных работнікаў трэсту тэрмінам ня менш, як на адзін месяц, абавязаўшы таварышоў выехаць да 15 мая. ЦП саюзу торфа-сланцавай прамысловасьці прасачыць за выкананьнем.

3. Абавязаць кіраўніцтва торфазаводаў кармінова паслаць адказных вярбоўшчыкаў на вярбоўку работніц па здабычы і ўборцы торфу. Райпрафсаветам, у раёнах якіх праходзіць вярбоўка, забясьпечыць дапамогу ў разгорнутым маладзёжным рабоце, і прыцягненьне жаночай рабочай сілы на торфараспрацоўкі, наладзіўшы кантроль над работай вярбоўшчыкаў і клясавым падборам вербаваных.

4. Абавязаць аргсэктар ЦСПСБ не пазьней 25 мая скончыць вылучэньне 10 прафработнікаў у распараджэньне ЦП саюзу торфа-сланцавай прамысловасьці.

5. Даручыць сэктару працы - т. Ковенскаму разам з т. т. [illegible] і Арндтам і Кармінова прасіць ЦК ЛКСМБ арганізаваць правэрку выкананьня дырэктыў аб вылучэньні 1.000 камсамольцаў.

6. Абавязаць сэктар масавай і культурнай работы ЦСПСБ выкарыстаць вопыт новай формы сацыялістычнай суперніцтва і заводаў — спажыўцоў торфу з торфазаводамі, вызначыўшы формы канкрэтнай дапамогі па лініі гаспадарчых органаў — дапамогай у кіраўдарчых органаў — дапамогай у кіраўніцтве, перанясьненьнем вопыту з прадпрыемстваў на торфазаводы, узаемадапрыемстваў на торфазаводы, узаемадапамогай у рабоце цэхаў і аддзелаў (ТНБ, рацыяналізацыя, спаравазданасьць, калькуляцыя), арганізацыяй сумесных тэхнічных нарад і інш.

7. Фабзаўкомам прадпрыемстваў і электрастанцыі, якія шэфствуюць над торфазаводамі, уключыцца ў непасрэдную дапамогу торфкомам у правядзеньні вытворчай, масавай і культурнай работы, укараненьні форм сацыялістычнай працы, устанавіўшы плянамерную дапамогу ў штодзённай сазоннай рабоце ка мандамі ў складзеных бюракратычна, у таварах, рабочыя аб ім ня ведаюць. Плян да рабочых не даведзен, таму рабочыя ня могуць магчымасьці высунуць сустрэчны.

Кепска стаіць справа з вярбоўкай рабочай сілы асабліва жаночай. Заяўлена ўсяго 50% патрэбнай рабочай сілы. Кепска стаіць справа з забясьпечэньнем рабочых прадуктамі і прамтаварамі. Белкаапсаюз да гэтага часу ня выканаў нарадаў на рыбу, махорку, мыла і мануфактуру. Рабочыя толькі на 40% забясьпечаны спецвопраткай. Заказы на торфарэзкі і на іншыя дрэнна выконваюцца гомельскімі заводамі —«Пралетары» і «Рухавік рэвалюцыі», ня гледзячы на шматлікія дырэктывы.

Сьпіс прадпрыемстваў, прымацаваных да торфазаводаў для вытворча-культурнага шэфства

Гомельская гута — торфазавод «Вальшавік».
Крычаўскі цэмэнтны завод — торфазавод «Вялікі мох».
Запалкавая фабрыка «Дніпро» — торфазавод «Заходнянскі мох».
Гута «Камінтэрн» — торфазаводу «Зьвязда».
Электрастанцыя імя Леніна (Барысаў) — «Чырвоны Кастрычнік».
Магілёўская шаўковая фабрыка — торфазавод «Чырвоная Беларусь».
Менская электрастанцыя — торфазавод «Чырвоны сьцяг».
Крычаўскі фасфарытны завод — «Калектыўная праца».
Гута «Ільліч» — «Ленінскі шлях».
Папяровая фабрыка «Чырвоная зорка» — торфазавод імя 1 мая.
Белдрэс — Асінторф.
Папяровая фабрыка «Гэрой працы» — торфазавод «Шлях сацыялізму».

Без запасных частак і змазачных матар'ялаў

ЗА 7 МЕСЯЦАЎ 5 ДЫРЭКТАРОЎ

На Барысаўскім торфазаводзе «Чырвоная сілай» пагражаючае. Замест 350 гарфяніку ёсьць толькі 75, замест 120 гарфяніц — толькі 16. Прарыў у забясьпечаньні рабсілай тлумачыцца несвачасовым і бясплянавым парадкам вярбоўкі. Ня гледзячы на свачасовае абмеркаваньне гэтага пытаньня на вытворчых нарадах, былы дырэктар Тумашэнка ня даў вярбоўшчыкам цьвёрдых установак для кантрактацыі рабочай сілы.

Блытаніну ўнёс і Наркомпрацы.

Торфазаводу былі прадастаўлены раёны для вярбоўкі — Астрашыцка-Гарадзецкі, Лагойскі, Лепельскі і Барысаўскі. Калі вярбоўшчыкі прыехалі ў Астрашыцка-Гарадзецкі раён, аказалася што раён, як адміністрацыйная адзінка, ліквідаваны і што для вярбоўкі рабсілы патрэбен новы дазвол. **У Лагойскім раёне супроць вярбоўкі выступіў інспектар працы.**

У палове красавіка заводу дан Камарынскі раён. Выехалі туды вярбоўшчыкі на чале з самім дырэктарам, але ніякіх вестак ад іх пакуль-што няма.

Тым часам на торфазаводзе без гаспадарчага вока падрыхтоўка да сезону ідзе вельмі марудна. Ня скончана абсталяваньне баракаў для рабочых, мэдыцынскі пункт яшчэ не адкрыт. Інспэктар аховы здароўя Нэйбург кажа, што няма каго пасьлаць. У сталоўцы не хапае начыньня. Харчы здавальняючыя. Адчуваецца недахват у спецвопратцы.

Машыны на заводзе сабраны, але запасных частак няма. Завод зусім не забясьпечан змазачнымі матар'ялмі, бо заяўкі былі зроблены несвачасова. Адсутнасьць змазачных матар'ялаў пабылі даны абяцчаньні на запасныя часткі, да гэтага часу ня выканаены. Рамонт машын зроблен дэтэрмінова, але устаноўка іх на балоце пачалася позна і да гэтага часу з 4-х машын на месцы стаіць толькі адна.

Поле сьцілкі да гэтага часу не падрыхтавана. Старое поле занята торфам вырабу мінулага сэзону і, з прычыны нявывазкі 50% торфу і адсутнасьці нагляду за вывазкай (ніжніх пластоў торфу не забралі), цяпер няма куды класьці новы торф.

Копшкаў для носкі торфу няма. Зробленыя замест іх насілкі важаць каля 48 кілг. Такія насілкі і без торфу могуць насіць толькі фізычна-моцныя мужчыны, але не дзяўчаты. Трэба тэрмінова зрабіць лёгкія фанэрныя скрынкі.

Зацікаўленасьць адміністрацыі падрыхтоўкай да сезону невыстарчальная. Галоўнае — бясплянавасьць, якой спрыяе частая зьмена дырэктароў (за апошнія 7 месяцаў зьмянілася 5 дырэктароў). На заводзе поўнае безгаспадарчасьць. Некалькі тон жалеза, якія атрымаў завод, згружаны там, дзе зажадалася возчыкам. Таму жалеза раскідана па лесе і каму не лянота, той і цягне. Сякі пастаўлены на зямлю без падкладак, таму жалеза іржавее.

Гаспадарчыя, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны дабіцца рашучага пералому ў рабоце торфзаводу.

Брыгада «Зьвязды» і «Вальшавіка Барысаўшчыны»:
БАГДАНАЎ, ГЕЛЬФЭР, ШЫДЛОЎСКІ, ХОМІЧ, РЖЭЎСКІ, ЛАГУНОЎ.

Габінэнты плян не нарадзіў сустрэчнага

ГОМЕЛЬ (Нашкар.) — Торфазавод «Шлях сацыялізму» за ўсе гады [illegible] работы мае адны прарывы. Добрасьць фабрыка «Гэрой працы» [illegible] выпадкі поўнасьцю забясьпечана торфапалам. Аднак, пачынаючы з 1931 г. па 1930 г. уключна, торф зусім не возіўся 1 толькі ў 1930 г. выконвае 30% усяго падрыхтаванага торфу.

У выніку добрусская фабрыка адчувае вялікі недахват палу і працуе з нагрузкай ня больш 40%.

Характарыстычны апартуністычны практыкі кіраўніцтва торфазаводу ня служыць той факт, што [illegible] сьнежня торф пачалі вывозіць у [illegible] тым. За трактарамі ніякага нагляду [illegible] было. Большасьць трактараў выйшла са строю. Таму вывазка тоны торфу каштавала 22 руб. у той час, як [illegible] вазка коньмі каштавала 6 руб.

Да пачатку сезону торфазавод [illegible] не падрыхтаваўся. Плян торфаразк[illegible] ня ўвязан з плянам фабрыкі: замест 140 тысяч тон, якія патрэбны будзе фабрыцы, торфазавод [illegible] выпачаце [illegible]граму ў 118 тыс. тон. Плян торфаразку складзен бюракратычна, у табліцах, рабочыя аб ім ня ведаюць. Пляны да рабочых не даведзен, таму рабочыя ня могі магчымасьці высунуць сустрэчны.

Лёзунгі ЦК КП(б)Б

да ўсебеларускага месячніка пралетарскага друку

1. «Роля газэты не вымяжоўваецца толькі адным распаўсюджваньнем ідэй, адным палітычным выхаваньнем... Газэта—ня толькі калектыўны прапагандыст і калектыўны агітатар, але таксама і калектыўны арганізатар» (Ленін).

2. «Друк—самая моцная, самая вострая зброя партыі» (Сталін).

3. Пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху—разгорнуты плян работы рабселькораўскай армії.

4. У кожным цэху, кожным калгасе, саўгасе, машына-тракторнай станцыі і населеным пункце створым насыценную газэту пры абавязковай умове забясьпячэньня партыйнага кіраўніцтва імі.

5. Рабкоры! У першыя рады барацьбітоў за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за пераатварэньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў штодзённыя мэтады ўсёй работы па будаўніцтве сацыялізму.

6. Селькоры калгасаўі ў першыя рады барацьбітоў за сацыялістычную арганізацыю працы ў калгасах, за далейшы ўздым хвалі калгаснага прыпіву.

7. Выканаем і перавыканаем пляны пасеўнай плошчы, па-бальшавіцку падрыхтуемся да ўборачнай кампаніі. Ліквідуем кулацтва, як клясу на базе суцэльнай калектывізацыі.

8. Барацьба за сацыялістычную жывёлагадоўлю, за вырашэньне праблемы тэхн

У атаку за лён

Першая дэкада мая не дала ніякага зруху ў ходзе ільназагатовак

На 10 мая плян выканан толькі на 40,9 проц.

Неадкладна ўзмацніць работу. У бліжэйшыя дні дабіцца карэннага пералому. Выканаць дырэктывы вышэйшых партыйных і савецкіх органаў аб фарсаваньні і поўным выкананьні пляну ільназагатовак

Адозву рабочых „Дзьвіны"--у гушчу бядняцка-серадняцкіх мас

Апошнія даныя аб ходзе ільназагатовак па БССР паказваюць выключна дрэннае становішча гэтай важнейшай кампаніі. ВОСЬ УЖО ЗВЫШ МЕСЯЦА, ЯК ЗАГАТОЎКІ ФАКТЫЧНА АМАЛЬ ЗУСІМ СПЫНІЛІСЯ. На 5 красавіка гадавы плян быў выкананы на 39,6 проц., а на 10 мая—на 40,9 проц. Такім чынам, за месяц і пяць дзён па БССР загатоўлена толькі... 1,3 проц. гадавога пляну.

Камэнтары да гэтых лічбаў непатрэбны. Яны выразна сьведчаць аб ганебных тэмпах загатовак, аб сур'ёзнай пагрозе забесьпячэньню тэкстыльнай прамысловасьці сырцом. БССР—адзін з асноўных ільнаворчых раёнаў, павінна даць тэкстыльнай прамысловасьці 24 тысячы тон ільнавалакна. Гэта баявое заданьне—пад рэальнай пагрозай зрыву.

У чым-жа корань зла? Чым тлумачыцца глыбокі прарыў у ільназагатоўках?

Асноўная прычына — АПАРТУНІСТЫЧНАЯ НЕАДАЦЭНКА КАМПАНІІ З БОКУ МНОГІХ МЯСЦОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, ВЫКЛЮЧНАЯ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ ЗАГАТОЎЧЫХ СЫСТЭМ БССР. Ня гледзячы на зусім выразныя і катэгарычныя дырэктывы вышэйшых партыйных і савецкіх органаў, на штодзённыя сыгналы друку, раённыя арганізацыі і сельсаветы на мясцох не пераключыліся дагатуль на бальшавіцкія тэмпы работы, на прыняті мер для максымальнага фарсаваньня загатовак.

АДОЗВА РАБОЧЫХ ФАБРЫКІ «ДЬВІНА» І АРШАНСКАГА ІЛЬНАКАМБІНАТУ, ЯКАЯ ЗАКЛІКАЛА ЎСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ НЕАДКЛАДНА ЎЗМАЦНІЦЬ ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ, ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ТЭКСТЫЛЬНУЮ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ НЕАБХОДНЫМ СЫРЦОМ — ГЭТА АДОЗВА ПРАЙШЛА МІМА ЎВАГІ БОЛЬШАСЬЦІ НІЗАВЫХ ПАРТЫЙНЫХ І САВЕЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ. Яны ня здолелі рэалізаваць гэтай адозвы для мабілізацыі шырокіх мас працоўных на ліквідацыю прарыву ў ільназагатоўках.

Рад раёнаў сыстэматычна ня зыходзяць з чорнай дошкі «Зьвязды» за ганебны правал загатовак. Мазырскі, Парыцкі, Нараўлянскі, Расьнянскі, Сьвіслацкі, Чырвонаслабодзкі, Чэрыкаўскі, Юравіцкі, Асіпавіцкі, Быхаўскі, Гомельскі, Дрыбінскі, Кармянскі і Лагойскі раёны за ўвесь час кампаніі загатовілі толькі... ад 10 да 20 проц гадавога пляну. Інакш, як праявай правага апартунізму на практыцы гэты факт кваліфікаваць нельга.

Замест таго, каб прыцягнуць да суровай адказнасьці кулакоў — сабатажнікаў ільназагатовак, многія мясцовыя арганізацыі адносяцца да іх прымірэнча.

У радзе месц цьвёрдыя заданьні да гэтага часу нават не даведзены да ўсіх кулацка-заможных гаспадарак.

Дабілі маруздіць! Кожны дзень дарагі! Трэба зараз-жа дабіцца максымальных тэмпаў у ходзе ільназагатовак!

Адозва рабочых фабрыкі «Дзьвіна» і аршанскага ільнакамбінату павінна быць неадкладна рэалізавана і даведзена да кожнага калгасьніка, кожнага адказасобніка — бедняка і серадняка.

БССР можа і павінна даць тэкстыльнай прамысловасьці 24.000 тон ільнавалакна.

„Новых лічбаў няма, карыстайцеся старымі"

ВУШАЧЫ. (Наш кар.).

Ільназагатоўкі па Вушацкім раёне на працягу ўсёй зімы праходзілі марудна. Зараз гэта работа амаль зусім спынена. На сёньняшні дзень плян загатовак выкананы толькі **на 27 проц.**

Адказныя раённыя работнікі апусьцілі рукі, цьвердзячы, што плян загатовак перэальны і паўрад ці зможа быць выкананы.

Кіраўнікі райкому КП(б)Б і райвыканкому ня ўжываюць ніякіх мер для ўмацненьня загатовак. **Чацьвёрка па барацьбе за лён не працуе.**

У выніку за першую дэкаду мая не загатоўлена ні аднаго кілё ільну. Зараз сельсаветы ў зводках проста паведамляюць: **«Новых лічбаў няма, карыстайцеся старымі».**

Кулацка-заможныя элемэнты ня выконваюць цьвёрдых заданьняў, а раённыя арганізацыі адносяцца да гэтага прымірэнча, не даюць адпору кулацкаму сабатажу. Яшчэ больш: народны суд апраўдаў кулака з **Завячэльскага** сельсавету, які ня здаў ні аднаго кілё ільну.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай практыцы вушацкіх раённых арганізацый. Барацьба за лён у раёне павінна быць узмоцнена.

Аб чым гавораць лічбы

Паводле даных Наркамснабу на 10 мая па БССР плян загатовак па ільна-валакне выкананы *на 40,9 проц.*, па ільняным семі—*на 58,7 проц.*

Апошнія дзьве пяціднёўкі не далі ніякага зруху ў ходзе загатовак. *За дэкаду загатоўлена ўсяго 0,2 проц. гадавога пляну.* Ганебнае зьніжэньне тэмпаў Ільназагатовак тлумачыцца выключнай бязьдзейнасьцю загатоўчых сыстэм—*Белкаапсаюзу, Белільнасаюзу і Белхлебжывёласаюзу.* Да апошняга часу гэтыя арганізацыі не пераключылі сваёй работы на баявыя тэмпы, нічога не зрабілі для фарсаваньня загатовак.

Фарсаваць будаўніцтва Шклоўскага ільназаводу

ШКЛОЎ.

Шклоўскі раён адзін з ільнаводча-жывёлагадоўчых раёнаў БССР. У гэтым годзе пасеўная плошча пад ільном у раёне пашырэцца да 7.400 гэкт. На тэрыторыі раёну будуецца вялікі ільназавод.

У асноўным пабудова заводу скончана. Застаўся толькі мантаж абсталяваньня. Павінны быць устаноўлены 2 шэйнг-турбіны, кудзеляжатоўчая машына, 4 ільнамялкі і інш.

Тэрмін пуску заводу быў вызначан у пачатку і студзеня 1931 г. Потым перанесен на 1 красавіка, далей на 1 чэрвеня. Але і зараз невядома, калі будзе пушчан завод.

Ільнаканапляводбуд прыслаў манцёраў для падрыхтоўкі абсталяваньня да мантажу, але пакуль што яшчэ няма разьлікаў і дэталяй па ўстаноўцы і абмураваньню каталёў.

Ёсьць затрыманьне таксама ў будаўнічых матар'ялах. Сэктары будаўніцтва Дзяржпляну і Белдзяржбуду ў свой час пазычылі на заводзе рад будаўнічых матар'ялаў, але да гэтага часу іх не вярнулі.

Не забясьпечан завод і рабочай сілай. Зяўкі, даныя Наркампрацы, пакуль што не задаволены. Наркампрацы нават не адказаў заводу аб становішчы з забесьпячэньнем рабочых.

Такім чынам, становішча з будаўніцтвам заводу зусім дрэннае. Дагаворы на кантрактацыю ільну пасеву гэтага году ўжо падпісаны. Раён можа стаць перад фактам неабходнасьці накіроўваць лён для апрацоўкі ў які-небудзь іншы раён.

Неабходна прыняць рашучыя захады, каб фарсаваць будаўніцтва заводу. Апошні павінен быць пушчан у бліжэйшы час. Кіруючыя раённыя арганізацыі павінны аб гэтым сваячасова паклапаціцца.

Чорная дошка

раёнаў, якія ганебна правальваюць ільназагатоўкі

РАЁНЫ	Проц. выкананьня пляну на 10 мая
Мазырскі	10, 3
Парыцкі	14,4
Нараўлянскі	11,9
Расьнянскі	14,5
Сьвіслацкі	13,3
Чырвона-Слабодзкі	12,9
Чэрыкаўскі	15,2
Юравіцкі	13,5
Асіпавіцкі	15,9
Быхаўскі	18,7
Гомельскі	17,4
Дрыбінскі	16,4
Кармянскі	17,0
Лагойскі	16,6

Спадзяюцца на самацёк

ВЕТРЫНА.

Раённыя загатоўчыя арганізацыі зусім спынілі загатоўку ільну. Усяго па раёне загатоўлена 24,6 проц. пляну. За дэкаду з 25-га красавіка да 5-га мая не загатоўлена ніводнага цэнтнэра. Апартуністычная бяздзейнасьць загатоўчых сыстэм не сустракае адпору з боку кіруючых раённых арганізацый, якія спадзяюцца выключна на самацёк.

Мабілізаваліся на ліквідацыю прарыву

ГЛУСК.

Пасьля таго як Глускі раён быў занесен **«Зьвяздой»** на чорную дошку за зрыў адгрузкі бульбы прамысловым цэнтрам, раённыя арганізацыі мабілізавалі ўвесь актыў на ліквідацыю прарыву.

У сельсаветы пасланы спэцыяльныя і вывазкі бульбы. Брыгады [illegible] загатовак ліся пэўнага зруху ў ходзе кампаніі. Аднак да поўнага выкананьня пляну яшчэ далёка. На 8-га мая было адгружана толькі 300 тон замест 1.800 тон, вызначаных заданьнем. Трэба яшчэ больш узмацніць работу.

Я. ГЕРАЎКЕТ.

Добрыя рэзалюцыі і сумныя справы

ЧАРЭЯ. (Наш кар.). Чарэйскі райвыканком ніяк ня можа адвыкнуць ад старых мэтадаў работы, «засядацельскай» мітусьні і пісаньня пустых прыгожых рэзалюцый. Замест жывой практычнай работы на мясцох амаль кожны дзень наладжваюцца пасяджэньні і нарады, дзе прымаюцца рэзалюцыі, выкананьня якіх ніхто не правярае. У выніку дрэннага кіраўніцтва, слабай сувязі в месцамі ў раёне ёсьць рад прарываў па ўсіх відах загатовак.

Гадавы плян лесазагатовак па экспарце выкананы толькі нападку. Райвыканком ня прыняў ніякіх мер да спагнаньня з кулацка-заможных гаспадарак усіх відаў загатовак, асабліва ільнавалакна і сена. Зараз у Чарэі пачалі будаваць ільнакамбінат, але райвыканком не дапамагае начальніку работ, лес вывезен няпоўнасьцю і цэглы не хапае.

Спажывецкае таварыства за апошні квартал не сабрала ні капейкі паявых узносаў. Запазычанасьць устаноў страхкасе складае 9 тыс. руб.; райкамбінат за электрычнае сьвятло не спагнаў каля 6 тыс. руб. За кулакамі лічыцца запазычанасьць па розных відах абавязковых плацяжоў у некалькі тысяч рублёў.

Трэба выкарчаваць карэньні апартуністычнай бязьдзейнасьці ў Чарэйскім раёне.

Т.

МЕНСК

60 тысяч р.--на дапамогу пацярпеўшым ад паводкі

У дадатак да ўжо прынятых урадам мер, СНК асигнаваў у распараджэньне рэспубліканскай камісіі 60 тысяч руб. на аказаньне першай дапамогі асабліва пацярпеўшаму ад паводкі працоўнаму насельніцтву. Белкаапсаюзу прапанавана выпучыць дадатковы фонд прамтавараў для дапамогі пацярпеўшым, паводле заявак раёнаў.

Вынікі рэарганізацыі с.-г. каапэрацыі

Савет Народных Камісараў БССР у сваёй пастанове аб выніках рэарганізацыі с.-г. каапэрацыі БССР адзначыў, што сыстэма сельска-гаспадарчай каапэрацыі зусім слаба выканала дырэктывы партыі і ўраду аб набліжэньні практычнай работы яе да запатрабаваньняў калгасаў, вытворча-каапэрацыйных таварыстваў і аднаасобных бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Для паляпшэньня далейшай работы с.-г. каапэрацыі, СНК прызнаў патрэбным аб'яднаць Белхлебжывасаюз, Белільнаканапляводсаюз і Белсадгародсаюз у адзіны цэнтральны саюз сельска-гаспадарчай каапэрацыі, ажыцьцявіўшы гэта мерапрыемства пасьля правядзеньня веснавой кампаніі. Пытаньне гэта будзе канчаткова вырашана саюзным урадам. Акцыянэрнаму таварыству Сельгаспаб перададзены ўсе функцыі па забесьпячэньні сельскай гаспадаркі буйнымі і дробнымі с.-г. машынамі і прыладамі, а таксама будаўнічымі матар'ялам.

Максымальна скарыстаць водны транспарт

Прэзыдыум ВСНГ прапанаваў прамысловым аб'яднаньням, пад асаблівую адказнасьць кіраўнікоў апошніх, ні ў якім разе не дапушчаць перавозак грузаў па чыгунцы, якія можна даставіць на месца прызначэньня водным шляхам.

Прэзыдыум абавязаў усе аб'яднаньні прыняць захады да сваячасовай падвозкі грузаў да прыстаняй.

Курсы па перападрыхтоўцы старшынь ФЗМК

ЦСПСБ адкрыў з 15 мая ў пяці гарадох БССР — Менску, Гомелі, Віцебску, Бабруйску і Магілеве — шасьцітыднёвыя курсы па перападрыхтоўцы старшынь ФЗМК. Праз курсы пройдзе 250 чалавек.

На дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня

— На ўсёй Беларусі ідзе ўзмоцнены збор сродкаў на дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня працоўным Савецкай Арменіі і Нахічавані. Вакол дапамогі разгортваецца сацпабораніцтва паасобных калектываў прадпрыемстваў і ўстаноў. Ужо сабраны дзесяткі тысяч рублёў.

— Раймасцком устаноў **Цераховскага** раёну сабраў сярод супрацоўнікаў 65 р. 50 к. і выклікаў усе мясцкомы раёну.

— Калектыў настаўнікаў і тэхнэрсаналу **музычнага тэхнікуму** ўнёс 70 руб. і выклікаў калектывы іншых тэхнікумаў.

— Калектыў **беларускага кіраўніцтва Саюзпаперы** ўнёс у фонд дапамогі 39 руб. 40 кап.

— **Халопініцкі** райпрафсавет, разам з райкамітэтам Чырвонага Крыжу, разгарнулі збор сродкаў на дапамогу пацярпеўшаму насельніцтву Нахічаванскай ССР. Ужо сабрана 495 руб. па падпісных лістох. Піянэры паставілі спэктакль, грошы ад якога ў суме 42 руб. пераданы ў карысьць пацярпеўшых ад зямлятрасеньня.

— Калектыў **3-й амбуляторыі** ўнёс у карысьць пацярпеўшых 38 руб. і выклікаў іншыя амбуляторыі.

— Па м. **БРАГІНА** сабрана за два дні 500 руб., якія пераведзены ЦК Чырвонага Крыжу. Сьперыскі сельсавет сабраў сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў 95 руб.

Супрацоўнікі Беларускай Акадэміі Навук сабралі ў фонд дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня 400 рублёў і выклікаюць усе навукова-даследчыя ўстановы БССР пасьледаваць гэтаму прыкладу.

***

Калектыў работнікаў **Менгаркому КП(б)Б, ЛКСМБ, гарКК і Дому Камсаветы, у адказ на выклік работнікаў рэдакцыі і друкарні «Зьвязда»** ўносіць 156 руб. у фонд дапамогі пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Закаўказьзі і выклікае супрацоўнікаў **гарсавету, гарпрафсавету, ДПУ, Наркам'юсту, СНК, ЦБК, Наркамгандлю і Наркамзему.**

АГУЛЬНЫ СХОД РАБОЧЫХ ЗАВОДУ «ЎДАРНІК» пастанавіў для хутчэйшага аднаўленьня зруйнаванай гаспадаркі ў Закаўказьзі адлічыць 1 проц. месячнай зарплаты.

За няпрысылку вестак аб выдаткаваньні збожжа

Белкантора Саюзхлеба, на аснове пастановы калегіі Наркамснабу СССР, спыніла водпуск збожжа Менскаму прыгараднаму, Чачавіцкаму, Рэчыцкаму, Полацкаму, Лёзьненскаму, Копанаўскаму, Ляднянскаму, Камарынскаму, Буда-Кашалёўскаму і Клічаўскаму райспажыўсаюзам, якія несвачасова прадставілі справаздачнасьць аб выдаткаваньні збожжа за тэрміны ад 2 да 5 месяцаў. Водпуск спынен да часу прысылкі вестак.

Назначэньні

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР назначыў тав. **Файнбурга, Ільлю Львовіча** намесьнікам народнага камісара Юстыцыі БССР.

Паводле пастановы ЦВК БССР, тав. **Г. М. Брыгневіч** назначан намесьнікам народнага камісара Асьветы БССР.

Будаўніцтва дамоў адпачынку

Савет Народных Камісараў БССР прыняў плян будаўніцтва дамоў адпачынку па лініі Галоўсацстраху на 1931 год на агульную суму — 1.564.000 руб.

Асигнаваныя Пустрахам 150.000 руб. на будаўніцтва піянэрскіх лягераў і калёніі рабочай моладзі — СНК БССР прызнаў неабходным скарыстаць наступным чынам: 70.000 руб. на будаўніцтва будынкаў для піянэраў і 80.000 руб. на пабудову летніх памяшканьняў для разгортваньня дамоў адпачынку рабочай моладзі. Прычым, дамы адпачынку моладзі павінны будавацца ў Менску, Віцебску і Гомелі.

СНК прызнаў патрэбным перадаць Галоўсацстраху існуючыя дамы адпачынку рабочай моладзі ў Менску, Віцебску і Гомелі. Перадача дамоў адпачынку рабочай моладзі не павінна адбівацца на захаваньні 15 проц. пропуску рабочай моладзі праз агульныя дамы адпачынку.

Умовы прыёму слухачоў у інстытуты Чырвонай Прафэсуры Камуністычнай акадэміі пры ЦВК СССР у асеньні кабер 1931 г.

Праводзіцца прыём у наступныя інстытуты: 1) Эканамічны, 2) Аграрны, 3) Сусьветнай гаспадаркі і сусьветнай палітыкі, 4) Тэхнікі і тэхнічнай палітыкі, 5) Савецкага будаўніцтва і права, 6) Гісторыі, 7) Філёзофіі, 8) Літаратуры, мастацтва і мовазнаўства і 9) Інстытут прыродазнаўства, 10) Сэкцыя па вывучэньні праблем вайны, 11) Інстытут па падрыхтоўцы кадраў да паступленьня ў ЧПІ.

У лік слухачоў у пералічаныя інстытуты чырвонай прафэсуры, акрамя інстытуту кадраў, прымаюцца члены ўсеКП(б), якія адказваюць наступным запатрабаваньням:

а) Узрост ня вышэй 35 год,

б) партстаж: для рабочых—5 год, для калгасьнікаў і служачых—8 год. Для адсталых нацыянальнасьцяй партстаж устанаўляецца: для рабочых—3 гады, для калгасьнікаў і служачых—6 год; галовы стаж актыўнай камсамольскай работы, партстаж устанаўляецца: для рабочых—3 гады, сялян і служачых—6 год;

в) для паступаючых у інстытуты кадраў устанаўляецца: 1) найвялікшы ўзрост 32 гады, 2) партстаж—5 год, 3) вытворчы стаж—5 год, 4) для адсталых нацыянальнасьцяй: партстаж — 3 годы вытворчы—5 год.

УВАГА: зьніжэньне партыйнага стажу для рабочых дапускаецца толькі пры ўмове, калі яны маюць вытворчы стаж ня ніжэй 4 год.

Тэрмін падрыхтоўкі слухачоў устанаўляецца ў 3 гады. Для інстытуту падрыхтоўкі кадраў—2 гады.

Слухачы атрымліваюць стыпэндыю ў разьмерах ад 225 руб. да 300 р. у месяц, у залежнасьці ад сямейнага становішча, і забясьпечваюцца інтэрнатам.

Ад паступаючых у інстытут Чырвонай Прафэсуры Камакадэміі патрабуюцца наступныя дакументы:

а) Заява аб прыёме з абавязковым паказаньнем выбранага інстытуту.

б) кароткая аўтабіяграфія, засьведчаная партыйнай арганізацыяй;

в) засьведчаная даведка аб партыйным стажы, сацыяльным становішчы і вытворчым стажы;

г) камандыроўка партыйнай арганізацыі (райком, ЦК);

д) дакумант (ці яго засьведчаная копія) аб асьвеце, калі такі ёсьць;

е) копія вайсковага дакументу;

ж) друкаваныя ці рукапісныя работы (калі такія ёсьць).

Заяву з неабходнымі дакумантамі накіроўваць у Культпроп ЦК КП(б)Б. Тэрмін падачы заяў ня пазьней 5 чэрвеня 1931 г.

УВАГА: Больш падрабязныя весткі аб умовах прыёму ў інстытуты Чырвонай Прафэсуры можна атрымаць у Культпропе ЦК і ў брыгадзіраў Камакадэміі, якія праводзяць вярбоўку слухачоў на мясцох.

Ствараем першы фільм

які адлюстроўвае змаганьне бальшавіцкага друку БССР за перамогі сацыялістычнага будаўніцтва

Дзякуючы сапраўды ўдарнай рабоце брыгады Імя „Зьвязды", фільм „Гураган" будзе гатовы ранейшага тэрміну. І паказан усебеларускаму зьезду рабселькораў

„Гураган"

На фабрыцы Белдзяржкіно «Савецкая Беларусь» першая ўдарная брыгада імя ЦО КП(б)Б «Зьвязда» ўдарнымі тэмпамі робіць здымкі карціны «Гураган», якая павінна паказаць ролю нацыянальнага друку ў сацыялістычным будаўніцтве (сцэнары Б. Брадзінскага і Г. Кобеца).

Пад кіраўніцтвам рэжысэра Ўлад. Вайнштока, аператарам Кальцатым і іншымі работнікамі брыгады ўжо закончаны здымкі павільёнаў, у якіх адбываюцца сцэны з сэзонпікамі-будаўнікамі (барак, сталоўка і г. д.), а таксама сцэна ў калгасе, калі дэзэртыра сацыялістычнай будоўлі сустракае арганізаваны адпор калектывізаванай вёскі.

Таксама у асноўным закончаны натурныя здымкі сцэн, якія адбываюцца на рыштаваньнях грандыёзнага будаўніцтва ільнакамбінату.

Зараз здымачная брыгада прыбыла ў Менск: тут будуць здымацца сцэны ў памяшканьні ЦК КП(б)Б, у будынку рэдакцыі і друкарні «Зьвязда» і г. д. У ходзе дзеяньня, таксама будзе засьняты новы сацыялістычны Менск.

Рдацкая і грамадзкія арганізацыі «Зьвязды» вылучаюць спэцыяльную тройку, якая едзе ў Ленінград на фабрыку Белдзяржкіно для таго, каб [illegible] ня непасрэдны ўдзел у здымках [illegible] важных сцэн (сцэна ў рэдакцыі) і палітычным рэдагаваньні фільму.

Вопыт непасрэднай сувязі беларускай пралетарскай грамадзкасьці [illegible] нен быць пашыран на ўсе астатнія здымачныя брыгады Белдзяржкіно.

Не падводзяць капчатковых вынікаў па ўсёй праробленай рабоце, [illegible] рая можна адзначыць, што [illegible] ўдарніцтва і сацспаборніцтва [illegible]

Кадр з фільму «Гураган»

кінематографіі палкам сябе [illegible] прывялі ўжо да некаторай [illegible] сродкаў, здымачным часе [illegible] якая зьяўляецца найбольш [illegible] імпартным матар'ялам.

Рашаючым для кожнай кінематографічнай карціны зьяўляецца [illegible] яе ідэалёгічнай якасьці. Гэта [illegible] можа быць забясьпечана толькі [illegible] большым напружаньнем сіл [illegible] здымачнай брыгады, кіраўніцтва [illegible] рыкі і саадзейнічаньня беларускай пролетарскай грамадзкасьці.

Тэмпы, якімі разгортвае работу [illegible] гада пры адпаведнай дапамозе грамадзкасьці, забясьпечаць магчымасьць выпуску фільму да адкрыцьця [illegible] кораўскага зьезду.

Першая кіно-брыгада імя радку стварае агітплякат,

У адказ на пастанову сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб месячніку друку першая ўдарная брыгада імя ЦО КП(б)Б «Зьвязда» [illegible] (Белдзяржкіно) улічваючы ўсю палітычную важнасьць кампаніі і неабходнасьці ўключэньня ў кампанію кінематаграфіі—пастанавіла:

1. Зьвыш пляну ў тры дні ва ўдарным парадку выпусьціць да пачатку месячніка друку агітплякат у 1-й частцы, з тым, каб гэты агітплякат быў-бы адным са сродкаў, ва ўсёй агітацыйна-прапагандысцкай рабоце партыі і [illegible] грамадзкасьці па растлумачэньня значэньня месячніка друку.

2. Яшчэ больш узмацніць [illegible] тэмпы работы і закончыць [illegible] «Гураган» (аб ролі нацыянальнага друку ў сацбудаўніцтве) на 15 дзён раньш тэрміну, з тым, каб скончыць [illegible] беларускага зьезду рабселькораў, 25-га ліпеня 1931 году.

Першая ўдарная брыгада імя ЦО КП(б)Б «Зьвязда».

„Зьвязды" ва ўдар[illegible] прысьвечаны месячні[illegible]

[illegible] гандысцкай рабоце партыі [illegible] грамадзкасьці па растлумачэньня значэньня месячніка друку.

2. Яшчэ больш узмацніць [illegible] тэмпы работы і закончыць [illegible] «Гураган» (аб ролі нацыянальнага друку ў сацбудаўніцтве) на 15 дзён раньш тэрміну, з тым, каб скончыць [illegible] беларускага зьезду рабселькораў, 25-га ліпеня 1931 году.

Першая ўдарная брыгада імя ЦО КП(б)Б «Зьвязда».

Перасьвятаўскі сельсавет патурае кулакоў

РЭЧЫЦА.

У Перасьвятаўскім сельсавеце патураюць кулакам, якія сабатуюць загатоўкі і вывазку бульбы. Ня ўсе кулакі атрымалі цьвёрдае заданьне. Так у вёсцы Гарывада кулак Мароз Мікалай да гэтага часу ня мае цьвёрдага заданьня па бульбе і па іншых відах загатовак. Да гэтага часу кулак Мароз [illegible] воднага кілёграму бульбы.

Сельсавет ганебна правальвае [illegible] не па вывазцы бульбы.

Райвыканком павінен неадкладна прыняць меры для аздараўленьня работы сельсавету і прыцягнуць [illegible] патураньні кулаком да адказнасьці.

В.

Паведамленьні

— **Партколегія ЦКК КП(б)Б** 20 мая у 6 гадз. веч., склікае параду партдасяцделяў ЦК сумесна з членамі ЦК і сакратарамі парткалектываў. Нарада адбудзецца ў памяшк. ЦКК (Савецкая, 55, 8-ці паверх, пакой № 18). Яўка абавязкова без спазьненьня.

— **Дом Камасьветы.** 20 мая у 8 гадз. веч., адбудзецца дакład т. Гольдбэрга «Палітыка партыі ў галіне тэхнікі». Білеты для парт. і камсам. актыву ў ГК КП(б)Б і ў чытальні Дому.

— **Фізтэхасацыяцыя.** 20 мая, у 7 гадз. веч., у пам. фіз. ін-ту (Зямляробчы зав.) адбудзецца пасяджэньне фіз.-тэхн. асацыяцыі. У парадку дня: 1) Абгаварэньне дакладу т. Усьпенскага «Праблема электрона». 2. Да тэорыі газавой электрычнасьці — даклад т. Сірачынскага.

— **Белтарнітса.** Сёньня у 7 гадз. веч., у клюбе навуковых работнікаў адбудзецца папыранае пасяджэньне праўленьня Белтарнітса, на якое запрашаюцца ўсе члены Белтарнітса.

— Тав. **Фрыд** (скончыўшая КУБ) выклікаецца па важнай справе 19/V—31 г. у 1 гадз. дня, у Культпроп ЦК, пак. № 11.

— 20 мая у 6 гадз. вечара ў памяшканьні ЦКК-РСІ (Савецкая, 55, 1-й паверх) адбудзецца пасяджэньне аб'яднанага бюро скаргаў НК РСІ з разьглядам наступных спраў:

1. Скаргаў калгасу «Расьсьвет» на Белкалгасцэнтр аб нявыдачы вызначанай прэміі — трактара.
2. Справа рабочага фабрыкі «Кастрычнік» Брадштэйна.
3. Справа абаронцы Царэвіча.
4. Скарга ЖАКТу № 13 на камгас аб самачынным вырубе фруктовых і ліпавых дрэў.
5. Аб доўгай нерэалізацыі прапановы рабочага шчотачнай фабрыкі т. Каплана.
6. Аб непарматнасьцях на заводзе «Ударнік».
7. Аб няправільным пераводзе Маязэльса з працы ў 1-й цыру[illegible]
8. Справа Бугрымовіча аб вымаганьні яго са складу студэнтаў [illegible] стрыяльна-пэдагагічнага тэхнікуму.
9. Справа аб непарматнасьцях у 32-й сталоўцы МЦРК.

Усе т.т., якіх гэтыя справы датычаць, павінны зьявіцца.

Выклікаюцца рабочыя засяданьня: Любін, Клянко, Непраш, Пагуляй, Гутман — Шчотачная фабрыка; Шыкевіч, Канэр, Саломін — Фабрыка [illegible]; воны тэкстыльшчык»; Вераш[illegible] — дом ураду; Штэйнгард і Фрыдман — завод «Бальшавік».

Папраўкі

У нумары 131 «Зьвязды» за 18 мая, у сьпісе новаабраных членаў праўленьня БелАШП'у і сакратарыяту яго дапушчаны недакладнасьці.

У склад праўленьня давыбраны т.т. **Александровіч, Бэндэ, Браштэйн** (у газэце не паказаны).

У складзе сакратарыяту [illegible] паказаны т.т. Браштэйн і Бітэнзон і не паказаны выбраны на пленуме ў склад сакратарыяту т.т. Мурашка і Дуней — сьпісе выбраных продстаўнікамі ад БелАШП'у ў «ВОАШП'е» не паказаны тав. Мурашка.

У пастанове камісіі выканаўчага [illegible] выкананьні пастаноў СНК СССР і СНК БССР аб зьменах у кредытнай рэформе, аб папярэдніх выніках дагаворнай кампаніі і аб пераводзе прадпрыемстваў на гаспадарчы разрахунак» (Зьвязда» № 128 за 15 мая) у канстатуючай частцы п. «г» пасьля слоў «фактычна здымалі з сябе гэтую адказнасьць» [illegible] Белдзяржснаб...» прапушчаны словы «пры заключэньні дагавораў з рэспубліканскімі, мясцовымі арганізацыямі».

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
РЫХТУЕЦЦА ДА ПАСТАНОЎКІ
НОВЫ ЦІКАВЫ ФІЛЬМ
вытворч. Украінфільм аб'ядн. Саюзкіно
УСЕ СПАКОЙНА...
драма ў 7 частках.
ч. I. Ад Днястра да Буга ўсё спакойна
ч. II. Шчасьце само ў рукі лезе
ч. III. Пад войку марш
ч. IV. Маўчыш
ч. V. Пан шаф Сігуранцы забаўляецца
ч. VI. Назад ні кроку
ч. VII. Ад Днястра да Буга зноў спакойна.

„Чырв. Зорка" Печ. у 7; 8.45; 10.30 — Экспамат з паноптыкуму. Зьвыш праг.—хроніка Саюзкіно № 20
„Культура" Печ. у 7; 8.45; 10.30 — З 15-мая новы фільм ДЖЫМ ШВАНТЭ. Зьвыш праг. камедыя Ромэна Ідмульета.
Інтэрнацыянал Печат. 1 с. у 7 г. — З 14 МАЯ пастаці фільм паводле апавяданьня ГОГАЛЯ САРАЧЫНСКІ КІРМАШ
„Пралетары" Печ. у 7 гадз. — З 15 мая нямецкі фільм ПРАБУДЖЭНЬНЕ ЖАНЧЫНЫ. Драма ў 6 частках.
„Юны Піянэр" Печ. з 1 г. дня. — Эпізод з грамадзянскай вайны БУХТА СЬМЕРЦІ. драма ў 7 частках.
„СПАРТАК" Печ. ч.6-30; 8; 9-30 і 11 Каса—з 5 гадз. — З 11-га мая выдатны фільм ПРАСТЫТУТКА. драма ў 7 частках.

Клюб імя Леніна і рэдакцыя газ. «Акцябр» скліканюць на 20-е мая
агульна-гарадзкую канфэрэнцыю
чытачоў газ. «Акцябр»
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Даклад рэдакцыі «Акцябр» (тав. Дунец).
2. Рапарт Цэнтрвыдавецтва (тав. Альтман).
3. Рапарт Яўсекцыі «Беларусь» (тав. Бронштэйн).
4. Выступленьні рабкораўскіх брыгад.
Пастаноўка Украінскага Ўдзяржтэатру „Гірш Лекерт".
Печатан у 6 гадз. вечара.

СЁНЬНЯ, у 7 гадз. веч. у памяшк. ЦК МОПР'у адбудзецца
па-зачарговае пасяджэньне
прэзыдыуму сумесна з сэктаркі ЦК МОПР'у і БССР.
Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў прэзыдыуму і членаў сэктараў абавязкова.
Пасяджэньне фракцыі—у 6 з пал. гадз.

МЕНГАРФА ПАЦЬВЯРДЖАЕ,
ШТО пры выдаче рабочым і служачым зарплаты за першую палову мая месяца,
адначасова культ. збор утрымліваецца ў разьмеры двайной стаўкі падаходнага падатку.
МЕНГАРФА

АПОШНІ ДЗЕНЬ ЗДАЧЫ ПАДПІСКІ на ГАЗЭТЫ і ЧАСОПІСІ 26 мая
Позьней гэтага тэрміну ПАДПІСКА на ЧЭРВЕНЬ ПРЫМАЦЦА НЯ БУДЗЕ
Сваячасова зданая падпіска—гарантыя акуратнай дастаўкі.
ГАЗБЮРО.

ЦК т-ва Чырвонага Крыжу БССР
ПАТРЭБНЫ
для пастаяннай работы наступныя работнікі:
1) Старшы бухгальтар,
2) Статыстык-інфармэтар,
3) Кіраўнік справ,
4) Машыністка-карэспандэнт.
Дагаварацца ў ЦК т-ва Чырвонага Крыжу, вул. К. Маркса, № 3.

ВЫШАЎ З ДРУКУ, ПАСТУПУ Ў ПРОДАЖ І РАССЫЛЯЕЦЦА ПАДПІСЧЫКАМ № 1
НОВАЙ МАСАВАЙ ДВУХТЫДЁВАЙ ЧАСОПІСІ
ЗА ТЭМПЫ КАЧЕСТВО ПРОВЕРКУ
Кіруючага органу ЦККР—РСІ, органу масавага кантролю.
Адказны рэдактар Ям. ЯРАСЛАЎСКІ.
У НУМАРЫ: Да нарады парткалегій КК: Ям. Яраслаўскі—сакратар Сах. Копцева; Б. Сахарава—Больш клясавай пільнасьці (уроні справы „рыбінкаў"). У НУМАРЫ: І. Бесьмясонові—Гаспразрахунак і сацыялістычнае планаваньне: Заплячкін—Бюро скаргаў—супар мас, бюро скаргаў—школа кіраўніцтва дзяржаваў; И. Сомо—Да задач другой бальшавіцкай весны; Ям. Яраслаўскі—Роля шэфства прадпрыемстваў над установамі ў рэканструкцыйны пэрыяд. Чыстка дзяржапарату на новым этапе і інш. артыкулы.
У НУМАРЫ: „Весенний сев требует большевистских темпов". „За большевистскую партийность". „Контроль исполнения генеральной установки в борьбе с бюрократизмом". „Шефство над совапаратом". „В ЦКК—РКИ". „Библиографія".
ЦАНА АСОБНАГА № 35 кап.
Падпісная цана да канца году (16 №№)—5 руб.
Падпіска прымаецца ўсімі паштовымі

БССР уступае у рашаючую дэкаду сяўбы

КАЛГАСНЫЯ ТАВАРНЫЯ ФЭРМЫ—

ВЕРНЫ ШЛЯХ ВЫРАШЭНЬНЯ ПРАБЛЕМЫ МЯСА І МАЛАКА

ВЕСНАВОЙ СЯЎБОЙ ЗАБЯСПЕЧЫМ КАРМОВУЮ БАЗУ КАЛГАСНЫХ ФЭРМ

Арганізацыю малочных фэрм

ЗАКОНЧЫЦЬ У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ

Арганізацыя і правільнае наладжанне работы малочных таварных калгасных фэрм адыграе вялізарную ролю ў справе вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі. Хуткае і выразнае праязджэньне дырэктыў партыі па арганізацыі малочна-таварных фэрм патрабуе ад усёй гаспадарчай сыстэмы неадкладна прыступіць да практычнай работы па калгасах.

Як жа пасьля гэтых катэгарычных указаньняў партыі і ўраду праходзіць справа арганізацыі і афармленьня МТФ. Дамо слова фактам:

На 10 мая па 85 раёнах арганізавана 3 малочна-таварных калгасных фэрм стадам у 27.078 кароў, плян выкаданы на 34,9 проц. **Капаткевіцкі, Крупскі, Лепельскі, Тураўскі, Талочынскі, Парахаўскі, Чачэрскі і Юравіцкі раёны** сём ня лічаць патрэбным паведамляць аб ходзе арганізацыі МТКФ. Якасныя паказальнікі ў справе арганізацыі МТКФ яшчэ больш ганебныя, чым колькасныя. Вось прыклады: **Мсьціслаўскі** райкалгасаюз арганізуе фэрму ў калгасе імя VI зьезду саветаў, гэту фэрму вылучаецца стада... 2 каровы і 1 цёлка. На тым-жа Мсьціслаўскім раёне калгас **«Вольная праца»** падае на малочную фэрму 26 галоў, з іх толькі 2 быкоў, цялят і ні аднэй каровы.

У **Заспаўскім** раёне калгас «Зьвязда» ужо два месяцы, як ня можа арганізаваць фэрму.

Ёсьць імкненьні арганізаваць МТКФ і тым, каб усю таварную прадукцыю адпраўляць на стол патрэбы. У **Бялынічскім** раёне калгас **«Чырвоны змагар»** згодзен арганізаваць фэрму пры ўмове калі для фэрмы будзе закуплена жывёла, а ўсё малако будзе скарыстоўвацца на патрэбы калгасьнікаў.

Па Копыскім раёне, пры заключэньні дагавору не агаворана таварнасьць малака, не прадугледжваецца папырэньне стада фэрм за лік гадоўлі маладняку.

Рэкорд галавацяцтва пабіў **Дрыбінскі** раён, які заключыў дагавор на арганізацыю МТКФ з калгасам **«Чырвоная горка»**, згодна якому калгас абавязваецца вылучыць на фэрму з абагуленага стада ўсяго двух быкоў. Бязумоўна, што такая малочная таварная фэрма ніякага малака ня дасьць.

У радзе раёнаў да дырэктывы партыі і ўраду аб арганізацыі МТКФ падыйшлі бюракратычна, па-чыноўніцку.

Ня лепш стаіць справа з выкананьнем дагавораў па здачы малака. Некаторыя фэрмы, якія заключылі дагаворы, малака дагэтуль не здаюць.

Неабходна ў далейшай рабоце па арганізацыі і разгортваньні работы МТКФ прытрымлівацца наступнага:

Фэрмы арганізуюцца ў тых малочна-жывёлагадоўчых калгасах, дзе ёсьць спрыяючыя ўмовы для збыту малака (бліжкая адлегласьць ад гораду, дому адпачынку, заводу па пераапрацоўцы малака) і пашырэньня таварнай жывёлагадоўлі.

Фэрмы арганізуюцца ў тых малочна-жывёлагадоўчых калгасах, якія маюць магчымасьць паставіць у момант выдзяленьня або па працягу мая ня менш 50 дарослых кароў.

У часе арганізацыі фэрмы абавязкова перадаецца ўся абагуленая буйная рагатая жывёла калгасу. У далейшым фэрма пашыраецца за лік атрымачай рагатай жывёлы і маладняка па нарадах райкаапсаюзу. Перадача жывёлы на фэрмы павінна быць скончана на працягу ня больш 10 дзён са дня заключэньня дагавору.

Калгас, які арганізуе МТКФ, абавязваецца ня менш 70 проц. малака, якое атрымліваецца ад стада, здаваць дзяржаўна - каапэрацыйным арганізацыям. Пры гэтым колькасьць малака, якое здаецца фэрмай, згодна дагавору, не павінна быць менш закантрактаванай колькасьці.

Гэтыя ўмовы павінны прадугледжвацца пры заключэньні дагавораў з МТКФ.

Неабходна сапраўды разгарнуць бальшавіцкія тэмпы ў справе арганізацыі МТКФ.

Я.

1.300 сьвінагадоўчых фэрм—

БАЯВАЯ ПРАГРАМА КАЛГАСАЎ

Для БССР, як аднаго з асноўных сьвінагадоўчых раёнаў Савецкага Саюзу на 1931 год вызначана плянам арганізацыя 1.300 сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм з 150.000 сьвінаматкамі.

Ня гледзячы на дырэктывы партыйных і ўрадавых органаў аб сканчэньні дагаворнай кампаніі з калгасамі да 10-га мая, у радзе раёнаў яшчэ нават не распачата гэта адказьнейшая справа. Зямельна-калгасныя арганізацыі некаторых раёнаў недаацэньваюць значэньня таварных калгасных фэрм у справе развіцьця калгаснай жывёлагадоўлі.

На 15 мая па 74 раёнах БССР арганізавана 560 сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм, у якіх знаходзіцца 12.680 сьвіноматак. Рэшта—24 раёны зусім не дасылаюць вестак аб арганізацыі сьвінагадоўчых фэрм. Гэта сьведчыць аб тым, што ў гэтых раёнах да арганізацыі фэрм яшчэ не прыступілі, ня гледзячы на тое, што яны маюць жывёлагадоўчы ўхіл. Вось гэтыя раёны: **Хойніцкі, Пухавіцкі, Камарынскі, Лагойскі, Рачыцкі, Парыцкі, Прапойскі, Чэрэйскі, Юравіцкі, Тураўскі, Сьвіслацкі, Лельчыцкі, Смалявіцкі, Нараўлянскі, Церахаўскі, Койданаўскі, Глускі.**

У многіх раёнах да арганізацыі фэрм і заключэньня дагавораў адносьліся фармальна па-бюракратычнаму. У дагавор ня вызначана пэўная колькасьць таварнай прадукцыі, якая павінна быць здана ў 1931 годзе. На некаторых-жа калгасах вызначана зусім нерэальная ліфба: напрыклад, па фэрме пры калгасе «Чырвоны маяк» (Гомельшчына), які мае зараз толькі 2 сьвіноматкі, у дагаворы вызначана здача ў гэтым годзе 900 штук адкормленых сьвіней, жывёвой вагой ў 900 цэнт.

Работу па адборы, арганізацыі і афармленьні дагаворамі сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм трэба зараз скончыць сапраўды ўдарнымі тэмпамі, своечасова выправіўшы дапушчаныя памылкі.

М. Страмон.

Раўняючыся па нормах перадавых ўдарнікаў, укараняючы зьдзельшчыну ў саўгасах і калгасах, максымальна ўшчыльняючы тэрміны,—па-бальшавіцку змагацца за выкананьне і перавыкананьне плянаў

Поўную нагрузку--трактару і каню

ЛІКВІДАВАЦЬ АБЯЗЬЛІЧКУ Ў РАБОЦЕ МТС

ПРАСТОІ ТРАКТАРАЎ І НЕЭКАНОМНАЕ ВЫДАТКАВАНЬНЕ ГАРУЧАГА

МТС адарваны ад вытворчага мыцьця калгасаў

Зводка аб ходзе сяўбы ў МТС на 15 мая

Назва МТС	План	Засеяна	Проц. выкананьня
Ветрынская	6.560	158	2,4
Асьвэйская	5.217	33	0,6
Лёзьненская	6.785	215	3,8
Сіроцінская	6.636	80	1,2
Горацкая	7.699	1.116	14,5
Мсьціслаўская	9.639	668	6,9
Лепельская	8.247	406	4,9
Шклоўская	9.563	421	4,4
Гарадоцкая	5.590	133	2,4
Расонская	6.100	1.000	24,6
Вушацкая	9.154	470	5,1
Дубровенская	5.265	127	2,9
Койданаўская	13.615	2.929	20,8
Заспаўская	7.929	730	9,2
Капыльская	5.452	577	10,6
Танежыцкая	6.360	916	14,4
Смалявіцкая	8.060	1.279	15,9
Слуцкая	5.400	739	11,3
Кімавіцкая	11.201	1.240	11,1
Церахаўская	6.670	332	5,0
Старадарожская	4.389	975	22,2
Жыткавіцкая	11.523	1.422	12,3
Менская	5.622	188	3,3
Дрысенская	6.600	205	3,1
Касьцюковіцкая	10.880	193	1,8
Боркавіцкая	6.600	200	3,0
УСЯГО	203.390	17.795	8,7

Зводка Трактарацэнтру сьведчыць, што МТС БССР злачынна адстаюць у разгортваньні сяўбы.

На 15 мая плян сяўбы ў раёнах МТС выкананы толькі на 8,7 проц.

МТС, якія павінны былі быць у авангардзе сяўбы, паказваць калгасам і аднаасобнікам прыклад ушчыльненьня тэмпаў сяўбы, ня здолелі арганізаваць работы трактарнага парку, у выніку чаго мы маем агідненькую нізкую тэмпы работ.

Да гэтага часу рад МТС абсалютна бязьдзейнічаюць, адарваны ад вытворчага жыцьця калгасаў, не вядуць ніякай вытворчай і масавай работы.

Вось характэрныя факты работы некаторых МТС, якія выразна тлумачаць такое нізкае, агіднае выкананьне плянаў сяўбы.

Старадарожская МТС паводле зводкі, як быццам выканала 22,2 проц. пляну сяўбы. Сапраўды-ж, МТС амаль ніякага ўдзелу ў выкананьні пляну сяўбы не прыняла. Чуючыць, у той час, калі на складах Райкаапсаюзу ляжаць нескарыстаныя новыя сэвяркі.

Прадукцыйнасьць працы трактараў вельмі нізкая. За 242 трактарадні засеяна толькі 196 гэкт.

Пры адпраўцы трактараў на вучасткі ня былі ўлічаны і вымераны плошчы трактарнай апрацоўкі. У выніку мы маем выпадкі масавага прастою трактараў і нізкую прадукцыйнасьць працы. Трактары пераганяюцца з аднаго калгасу ў другі бяз усякага пляну. У выніку —вялізарная страта гаручага, малая нагрузка трактараў.

Нагляд за работай трактараў у калгасах адсутнічае. Трактарысты адносяцца да трактараў вельмі нядбайна. У выніку на старадарожскай МТС 4 зусім новых трактары праз тры дні ўжо выйшлі ў рамонт і не працуюць.

МТС ніякага ўдзелу ў разгортваньні калектывізацыі па раёне ня прымае. Аграномы машынатрактарнай станцыі ня ведаюць, як праводзіцца зьдзельшчына ў калгасах раёну. У выніку такіх адносін а боку МТС да гэтага асноўнага пытаньня іх работы па Старадарожскім раёне мы маем па некаторых калгасах нават адліў. Так, калгас імя **Будзённага** з 20 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у выніку адсутнасьці разтлумачальна-масавай работы, разваліўся.

Ня лепш стаіць справа і на **МЕНСКАЙ МТС.** Трактары перад пасыпкай у калгасы не аглядаюцца. У калгасе імя Сталіна трактар з-за адсутнасьці гаручага прастоя дзень бяз працы.

Трактарысты ня ведаюць аб нормах выпрацоўкі. Масавая работа як сярод калгасьнікаў, так і сярод трактарыстаў не праводзіцца. У выніку мы маем выпадкі, калі трактарысты кідаюць у часе работы трактар бяз усякага нагляду і ўходзяць з работы.

Такі-ж малюнак і на **СЛУЦКАЙ МТС.** Расход гаручага значна перавышае вызначаныя нормы. Трактарысты не даюць вестак аб рабоце трактараў, аб выдаткаваньні гаручага.

На фоне слабой работы большасьці МТС вызначаецца работа **СМАЛЯВІЦКАЙ** трактарнай станцыі. Тут трактарысты на-сяўбу ня ўзяліся за выкананьне пляну сяўбы. Работа праходзіць без выхадных дзён на аснове разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва паміж асобнымі трактарамі і вучасткамі работ. Нормы выдаткаваньня гаручага даведзены да 16 клгр. (норма вызначаная Трактарацэнтрам). Падвозка гаручага арганізавана і трактарысты могуць бесьперапынна працаваць. Работа праходзіць у тых

Часу для сяўбы засталося вельмі мала. МТС павінны на-ходу выправіць усе памылкі, дабіцца максымальнага ўшчыльненьня тэрмінаў сяўбы.

А.

Як ідзе веснавая сяўба

ЗВОДКА НКЗБ

аб ходзе веснавой сяўбы на 15 мая 1931 году

СЭКТАРЫ І СЫСТЭМЫ	Усяго яравых беспакроўных у гэктарах			З іх (у процантах да пляну)		
	План	Засеяна	Проц. выкананьня	Збожжавых	Тэхнічных	Бульбы
Саўгасамі	109090	9201	8,4	10,9	0,9	4,2
Калгасамі	833599	74005	8,9	15,5	1,2	3,5
Аднаасобнікамі	1731537	115420	6,7	8,0	2,4	6,6
Усяго па БССР	2674226	198636	7,4	10,0	2,0	5,5

Сяўба па БССР разгортваецца вельмі нездавальняюча. На 15 мая засеяна толькі 198,636 гэкт., або 7,4 проц. пляну. Гэта ў той час, калі нарэшце прымаючы пад увагу позьні пачатак палявых работ, мы мелі права чакаць ня менш 25 проц. выкананьня пляну на 15 мая.

Недапушчальна разгортваньне ў-ба бульбы—5,5 проц. пляну, тэхнічных—2,0 проц. пляну.

Слабы, недапушчальны ход сяўбы тлумачыцца выключна тым, што раённыя арганізацыі ўсё яшчэ не паставілі перад сабою выкананьне плянаў сяўбы асноўнай задачай сённяшняга дня. Да гэтага часу калгасы і саўгасы ў радзе раёнаў поўнасьцю не пераведзены на зьдзельшчыну, што тармозіць разгортваньне сяўбы.

Раёны, у якіх працуюць машынатрактарныя станцыі, не зьяўляюцца паказальнымі з прычыны дрэннай работы МТС, якія не заняті [illegible]

У саўгасах, калгасах і МТС на сённешні дзень работа яшчэ не пастаўлена так, каб кожны калгасьнік, рабочы саўгасу і МТС ведаў, колькі сёньня павінна быць заселена на яго вучастку.

Зразумела, што пры такой слабой рабоце калгасаў і саўгасаў [illegible] і аднаасобнікі, якія на 15 мая выканалі толькі 6,7 проц. пляну паселу.

Такія тэмпы сяўбы ставяць пад пагрозу выкананьне сяўбы, своечасова яе сканчэньне.

Да канца сяўбы засталіся дні. Выкананьне задач пасяўнай кампаніі магчыма пры максымальнай напружанасьці ўсіх сіл раённых і вясковых арганізацый. У бліжэйшыя дні павінна быць поўнасьцю ўкаранена зьдзельшчына ва ўсіх калгасах і саўгасах. Неабходна дабіцца поўнай нагрузкі мэханічнай і конскай цягі.

Раённыя арганізацыі павінны памятаць, што кожны дзень марудзіньня ў правядзеньні гэтых важнейшых мерапрыемстваў зрывае своечасовае выкананьне пляну сяўбы.

Усе сілы на поўнае і своечасовае выкананьне сяўбы.

Вынік бясьпляновасьці ў выдаткаваньні кармоў

БОРКАВІЧЫ.

2-га мая калгасы «Шляхі Леніна», «Чырвоны партызан», і «Шляхі Леніна» [illegible] ці ў поле. Выезд паказаў, што калгасы добра падрыхтаваны да сяўбы. Калгасьнікі разьбіты па брыгадах, сельска-гаспадарчы інвэнтар і цягавая сіла замацаваны за кожным калгасьнікам, плян зьдзельшчыны даведзен да кожнага калгасьніка.

Горшая справа з калгасам «Замляроб», дзе з прычыны дрэннага кіраўніцтва больш як 20 проц. жывёлы загінула. У калгасах адчуваецца вялікі недахват кармоў, але ў той-жа час ні адзін з калгасаў не перайшоў на корм з гальля.

У калгасе Кімаўшчына таксама дагляд жывёлы вельмі дрэнны. Сечка, якую робяць з саломы з аўсом, кідаецца проста пад ногі коням, каровам даецца сухая сечка, ад якое жывёла хварэе. Гэта ў той час, калі можна завяршыць гарачым варам гэту сечку і жывёла будзе яе есьці ахвотна.

Большасьць калгасаў ніякага пляну ў выдаткаваньні кармоў ня маюць.

Г.

АСТОЙЛІВА ЗМАГАЮЦЦА ЗА СІЛАС

ВУШАЧЫ. (Наш кар.). Сіласаваньне ў мінулым годзе дало па **Вушацкім** раёне найлепшыя вынікі. Сілас [illegible] вымякчыў кармовыя трудзасьці калгасах **«Пралетары», «Цэлтне», «Чырвоне Поплачына»** і інш.

Гэтым годзе калгасы Вушацкага раёну ў большай настойлівасьці змагаюцца сілас. Кантрольная ліфба Белсцэнтру ў 3.700 тон зялёнай масы [illegible] калгасамі з перавышэньнем [illegible] тон.

[illegible] ужо распачата падрыхтоўка [illegible] сіласаваньня. Калгасы [illegible] сіласных культур, з іх 60 гэкт. пад [illegible], 25 гэкт. пад кукурузу і рэчыка-аўсянай мешанінай. Насеньсіласных культур калгасы забясьпечаны.

[illegible] калгасаюз вылучыў з свайго складу адказнага таварыша за правядзеньнем сіласаваньня. Калгасам дана дырэктыва аб ачыстцы старых сіласных ям. Міжнародны пэрыяд у старых ямах не засіласавана 750 тон. Для сіласаваньня будзе скарыстана атава асакі ў іх мясцох і на ўзьбярэжжы вазёр.

Самсамол таксама узяў на сябе вялікабавязкі па сіласаваньні. Кожнай [illegible] даны заданьні, што і калі зрабіць.

[illegible] недахопаў падрыхтоўкі да сіласаваньня трэба адзначыць тое, што райкаапсаюз ня можа выкуліць 10 бочак [illegible] для сіласных установак. Белсцэнтр тармозіць з крэдытамі.

ЭРМЫ ТОЛЬКІ НА ПАПЕРЫ

ВУШАЧЫ. (Наш кар.). У Вушацкім не павінны быць арганізаваны 6 малочна-таварных калгасных фэрм. Фактычна яны існуюць толькі на паперы. Калгасаюз абмежаваўся тым, што [illegible] плян арганізацыі фэрм і на гэтым [illegible] сваю работу скончанай. Паводле пляну малочна-таварныя фэрмы [illegible] мець звыш 700 кароў. У сапраўдсьці-ж разам з цялятамі ёсьць 520.

Адбор прадукцыйнай жывёлы для фэрм у калгасах не праведзен. Вытворчыя ляны МТФ ня складзены. Ужо палася сяўба, а калгасы дасканала ня [illegible] даюць якіх і колькі культур трэба сіяць.

Райкаапсаюз чакае канчэньня гэтага інструкцыі і дырэктыў з Белкалгасцэнтру. [illegible] ніякіх дырэктыў аб самой тэхніцы арганізацыі малочна-таварных фэрм [illegible] дае.

Белкалгасцэнтр павінен забясьпечыць раўніцтва райкалгасаюзам у справе [illegible] арганізацыі малочна-таварных фэрм.

ЕЛСЕЛЬБУД НЯ ТУРБУЕЦЦА...

У саўгасе **Завапочыца** ў гэтым годзе трэба пабудаваць 4 хлявы на 800 галоў жывёлы, артэзіянскі калодзеж і сіласную вежу.

18-ты вучастак Белсельбуду, якому даручана гэта будаўніцтва, зусім не клапоціцца ні аб матар'ялах, ні аб работах. Тэхнік Вішнеўскі нічога ня робіць. На будаўніцтве замест 150 рабочых, працуе толькі 30.

Рабочыя саўгасу абураны такімі чарашнімі тэмпамі будаўніцтва і патрабуюць ад Белсельбуду хутчэйшага разгортваньня будаўніцтва.

Б.

ПРА СІЛАС--ЗНОЎ ЗАБЫЛІСЯ

Насеньне сіласных культур месяц ляжыць на складзе

ХАЛОПЕНІЧЫ. (Наш кар.). У **Халопеніцкім** раёне ў мінулым годзе плян сіласаваньня быў выкананы ледзь на 60 проц. У радзе калгасаў ня верылі ў сілас і ніяк не зважаліся з тым, што з агародных адкідаў, з бульбяньніку можа атрымацца каштоўны корм.

Калі адкрылі сіласныя ямы, калгасьнікі адразу-ж упэўніліся ў каштоўнасьці сіласу і яго значэньні ў стварэньні кармавой базы.

— Усе роўна, як і віно—вось якую характарыстыку далі калгасьнікі сіласу.

З выхадам жывёлы на пашу ў раёне зноў забыліся пра сілас. Забылі, што прыдзе зноў зіма, якая вымагае шмат кармоў.

Што ж робіцца ў раёне з [illegible] падрыхтоўкі да сіласаваньня. Насеньне сіласных культур—кукурузы і сланечніка завезена, але спакойна ляжыць сябе на станцыі Крупкі. А ад станцыі да раённага цэнтру—30 клм., а да большасьці калгасаў—ад 50 да 60 клм. Калі райкалгасаюз, ці райкаапсаюз перавязуць насеньне са станцыі, так і невядома.

Насеньне сланечніка ўжо месяц, як завезена, але расцянкі на яго дагэтуль няма. У Белнасеннаводсаюз ужо былі пасланы тры тэлеграмы з просьбай паведаміць расцэнку. Толькі ўчора Белнасеннаводсаюз адгукнуўся тэлеграмай: «Прадаваць па сабекошце з 7-процантнай надбаўкай». Колькі-ж складае сабекошт ніхто ня ведае.

Камсамол, як шэф сіласу стаіць у баку. [illegible] спробам скараціць пляны сіласаваньня трэба даць бязьлітасны адпор.

Заўтра—пачатак месячніка пралетарскага друку

ПРАДПРЫЕМСТВЫ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

адказваюць на ліст менскіх ударнікаў друку

сустрэчнымі самаабавязацельствамі, канкрэтнай бальшавіцкай справай

Рапарт рабкораў заводу імя Ланцуцкага газэтам: „Зьвязда“, „Палеская Праўда“ і „Рабселькор“

Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам партыі

11 сьнежня 1929 г. у нас на заводзе імя Ланцуцкага выйшаў першы нумар друкаванай газэты **«Цягнік сацыялізму».**

Выхад аднаго нумару ў месяц не здавальняў чытачоў і рабочыя патрабавалі выпускаць газэту часьцей. З 15-га мая 1930 г. газэта пачала выходзіць рэгулярна 2 разы ў месяц. Рост актыўнасьці рабочых і рабкораў, прыцёк матар'ялаў прымусіў нас арганізаваць 5 насьценгазэт па цэхах, зараз іх II. Актыўнасьць мас узрастала. **Лепшыя ўдарнікі ўліліся ў рады рабкораў.** Асабліўы рост наглядаўся ў момант правядзеньня конкурсу на лепшую насьценгазэту, які працягваўся з 10 сакавіка па 15 мая. У пачатку 1930 г. было 131 рабкор, а зараз ёсьць 252 рабкоры. Лепшыя рабкоры-ўдарнікі ў колькасьці 47 чалавек вылучаны на адказную работу ў гаспадарча-прафэсыянальныя і партыйныя органы на вучобу.

Так рос і ўзмацняўся пад пастаянным кіраўніцтвам партыйнага камітэту наш заводзкі друк і разам з ім армія рабкораў.

У барацьбе за прамфінплян —перамаглі

Газэта адыграла значную ролю ў мабілізацыі работага калектыву на выпаўненьне прамфінпляну.

Калі ў мая 1930 г. па вагонным цэху быў вялікі прарыў, «Ц. С.» забіў трывогу, заклікаў не здавацьца тэмпаў працы, а прыняць усе меры, каб да XVI партызьезду прамфінплян выканаць на 100 проц. Рэдкалегія тэлеграмай сыгналізавала т. **Рудзутаку** аб забесьпячэньні цэху неабходным матар'ялам, а-за недахвату якога была пагроза арыву праграмы. Прарыў быў ліквідаваны і рабочыя заводу ў падарунак XIII зьезда КП(б)В і XVI зьезду УсеКП(б), **апрамантавалі 2 паравозы і 2 вагоны.**

У верасьні, калі завод заканчваў другі год пяцігодкі са значным прарывам, газэта прысьвяціла гэтаму пытаньню цэлую паласу з баявым заклікам:

«Верасьнёўская заданьне пад пагрозай, за 23 дні трэба выпусьціць 65 вагонаў, гэта заданьне цалкам рэальнае. Выканаць яго — баявое заданьне кожнага рабочага».

Па цэхах былі створаны пасты «Ц. С.» якія сачылі за своечасовай дастаўкай матар'ялу і апрацоўкай дэталяй. У выніку прарыў быў ліквідаваны і план другога году дэтэрмінова скончан на 102,78

Газэта бойка выступіла супроць апартуністаў, якія хавалі сустрэчны ў партфэлі. Па цэхах былі выпушчаны 4 спэцыяльных бюлетэні агляду ходу [illegible] даводзілі магчымасьць павялічыць прам фінплян. У выніку, замест вызначанага заводакіраўніцтвам прамфінпляну на 11 мільёнаў. руб., рабочыя далі **сустрэчны на 13 мільёнаў.**

Газэта шмат увагі аддала пытаньням барацьбы за якасьць прадукцыі, вядучы рашучую барацьбу з ліжэ-ўдарнікамі, рвачамі і лятунамі. Газэты і рабкоры заводу першымі выступілі на барацьбу з прагуламі і спазьненьнямі, за ўзьнікьце працдысцыпліны. **Прагулы і спазьненьні ў сакавіку,** параўнальна са студзенем зьменшыліся на 72,5 .

«Ц. С.» на сваіх старонках паказаў тых, хто сваімі каштоўнымі прапановамі спрыяў найхутчэйшаму выкананьню пяцігодкі за чатыры гады і бічаваў зажымшчыкаў рабочай ініцыятывы. Пры дапамозе газэты прапановы рэалізаваны на 90 проц.

Шмат рабкораў заводу зьяўляецца актыўнымі рацыяналізатарамі нашага заводу. Рабкор **Дубень** сваёй прапановай даў 364 руб. эканоміі ў год. Актыўны рабкор тав. **Шляхценка** ўнёс прапанову, якая дала эканоміі 630 руб. Рабкор **Андрыевец** сваёй прапановай даў 364 руб. эканоміі ў год. Рабкор **Бяпугін** унёс некалькі прапаноў, з іх праведзены ў жыцьцё пакуль дзьве, яны даюць эканоміі 793 руб. Прапанова рабкора **Авідона** сумесна з рабочым **Штукіным** дала 3.758 руб. эканоміі. Рабкор **Лізуноў**—ён жа майстар кавальскага цэху—унёс 5 прапаноў, якія далі гадовую эканомію ў 6.095 руб. Усе гэтыя прапановы праведзены ў жыцьцё і даюць эканоміі ўвогуле 12.304 руб.

Разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкай забясьпечылі посьпех барацьбы супроць апартунізму

На працягу ўсяго часу газэта змагалася за разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі. Яна рашуча выступала супроць яе зажымшчыкаў. Мы мелі такія выпадкі, калі асобныя бюро цэхпарт'ячэек, замест рэагаваньня ігнаравалі друк і рабкораўскі рух. Зажымшчыкі атрымалі на заслугах. **Партком заводу распусьціў бюро і цэхкамітэт мэханічнага цэху за нерэагаваньне на допісы.** У калёсным цэху за прымірэнцтва і нежаданьне змагацца з праявамі апартунізму распусьчана бюро. Член партыі **Камрун** за заціск атрымаў суровую вымову, **Адуконіс**—суровую вымову, **Атрашэўскі** — вымову і г. д.

На працягу некалькіх нумароў газэта сыгналізавала аб прарывах і непаладках у кавальскім цэху, дзе было правапартуністычнае кіраўніцтва. «Ц. С.» патрабаваў замены кіраўніцтва цэху. Майстар цэху **Ануфрыеў** быў зьняты з работы, перавыбрана бюро парт'ячэйкі.

Газэта патрабавала зьмены [illegible] Пасьля зьняцьця майстра і замены адміністрацыі, цэх стаў з посьпехам выконваць прамфінплян.

4-га лютага г.г. у перадавым артыкуле газэта дае рашучы ўдар па праявах апартунізму і прымірэнцтва, мабілізуючы масы на барацьбу за генэральную лінію партыі. Партыйны камітэт ударыў па апартуністах па заслугах. За прымірэнчыя адносіны да апартунізму былі распушчаны цэхкамітэты 1-га і 2-га корпусу вагоннага цэху.

«Цягнік сацыялізму» і рабкоры заводу цьвёрда стаялі на шлях барацьбы супроць апартуністычных скажэньняў у правядзеньні нацыянальнай палітыкі партыі. На сваіх старонках газэта змагалася з усякімі праявамі кулацкай ідэалёгіі, з неадаровымі антыпартыйнымі і непралетарскімі настроямі.

„За наш калгас адказваем так, як і за прамфінплян“

«За наш калгас адказваем так, як і за прамфінплян», — такую ўстаноўку дала газэта па пытаньні ўдзелу ў другой бальшавіцкай вясьне, яшчэ ў сьнежаньскім нумары «Цягніку». Газэта мабілізавала вакол сябе ўвесь актыў рабкораў. Кожны рабкор дапамагаў справе найлепшай падрыхтоўкі да вясны. **Газэта першай паставіла пытаньне аб своечасовым рамонце трактараў, яна арганізавала рабкораўскі пост «Цягніка» і «Палескай», які штодзенна сачыў за рамонтам трактараў і паведамляў праз друк.** Брыгада тав. **Вапынцова** і колькасьці 6-ці чал. абвясьціла сябе ўдарнай па рамонце трактараў і ўлілася ў рады рабкораў-ударнікаў.

У дэкаду і трохдзеньнік барацьбы за калектывізацыю і веснавую сяўбу, брыгады друку і вызнная рэдакцыя «Цягніку» праводзіла работу ў сваім падшэфным Церахаўскім раёне. Рабкоры наладзілі шчыльную жывую 1 пісьмовую сувязь з селькорамі калгасаў і практычна ім дапамагае ў рабоце.

Газэта прызнала і выправіла памылкі

У мінулым наша газэта зрабіла дзьве грубыя палітычныя памылкі:

1) Газэта да 3-га лістапада ня ўзьнімала барацьбы супроць апартунізму на прынцыповую вышыню, 2) «Цягнік», зьяўляючыся транспартнай газэтай, доўгі час невыстарчальна змагаўся за выкананьне трансфінпляну. Сыгналы «Палескай» былі зусім правільныя і своечасовыя. Рэдкалегія прызнала свае палітычныя памылкі, дапушчаныя ў газэце і хутка іх выправіла. Газэта пад кіраўніцтвам партыкамітэту стала сапраўдным змагаром за генэральную лінію партыі і за ажыцьцяўленьне пастаноў друку і рабкораўскага руху сярод усіх рабкораў і рабочых заводу арганізуючы брыгады рабкораў з удзельнікам рабочых ударнікаў; для ўсіх рабочых правесьці 5 гутарак.

Падцягнем слабыя вучасткі

Прабеламі ў нашай газэце мы адзначаем: нерэгулярны выпуск газэты, з-за чаго шмат каштоўнага матар'ялу заставецца ня зьмешчаным, невыстарчальнае асьвятленьне партыйна-прафсаюзнага жыцьця заводу, слабая сувязь газэты з Чырвонай арміяй і адсутнасьць хор — слаба пастаўлена масава-выхаваўчая работа з рабкорамі, сходы скліканцца рэдка, рэдкалегія «Ц. С.» негазэтамі, рабкорыя цэхавымі насьценгазэтамі, рабкорыя цэхаў.

Наш сустрэчны

Той новы ўздым сацыялістычнага будаўніцтва, у які мы ўступілі ў трэцім гадавіцтва, у які мы ўступілі ў трэцім годзе пяцігодкі, ставіць асаблівыя адказныя і асабліва складаныя задачы перад нашым вялікім бальшавіцкім друкам, які зьяўляецца моцнай зброяй у руках партыі.

Барацьба за завяршэньне фундамэнту сацыялістычнай эканомікі, за далейшае разгортваньне і ўзьнікьце яшчэ на вышэйшую ступень сацыялістычных форм працы, за далейшае разгортваньне сацыяльнай калектывізацыі і ліквідацыі на яе аснове кулацтва як класы, барацьба з усякімі праявамі апартунізму, як правым, так і «левым» і прымірэнцтвам да іх, — усё гэта вымагае перабудовы мэтадаў і форм работы нашых шматтыражак і насьценгазэт як фабрычна-заводзкіх, так саўгасных і калгасных.

Вітаючы прапанову менскіх ударнікаў і сустрэчны прамфінплян «Палескай», які мы поўнасьцю прымаем, мы апрача агульнай работы па рэалізацыі высунутых прапаноў, бярэм на сябе наступныя абавязкі:

1. На працягу месячніка друку дагальна прапрацаваць прапановы менскіх ударнікаў «Праўды», пастановы бюро гаркому, сакрагарыяту ЦК КП(б)Б і ЦК УсеКП(б) аб перабудове нізавога друку і рабкораўскага руху сярод усіх рабкораў і рабочых заводу арганізуючы брыгады рабкораў з удзельнікам рабочых ударнікаў; для ўсіх рабочых правесьці 5 гутарак.

2. З 1-га чэрвеня арганізаваць вячэрнія дзесяціднёўныя курсы для новавыбраных рэдактараў насьценгазэт, паставіўшы пытаньне перад культпропам парткому і гаркому аб забесьпячэньні адпаведнымі праграмамі і кіраўнікамі.

3. Да рабсельскораўскай зьезду арганізаваць у кавальскім цэху пазмэнныя насьценгазэты і як вопыт — адну брыгадную.

4. Да 15-га чэрвеня арганізаваць шмат тыражку ў сваім падшэфным Церахаўскім раёне, падрыхтаваць для яе асноўнага працаўніка — пешцага рабкораа ўдарніка, арганізуючы вакол яе актыў сельскораў.

Ва ўсіх падшэфных калгасах да рабсельскораўскага зьезду арганізаваць насьценгазэты. З 15-га па 25-га чэрвеня правесьці дзесяціднёўныя курсы рэдактараў насьценгазэт калгасаў у колькасьці 20 чал.

5. У мэтах ажыцьцяўленьня лёзунгу: «Кожны рабкор—ударнік, кожны ўдарнік—рабкор» ацэнуць у рады рабкораў усіх лепшых рабочых-ударнікаў з 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі нашы рады павялічыліся б да 100-процантнага ахопу ўсіх ударнікаў заводу.

6. З 1-га чэрвеня на старонках шматтыражкі сыстэматычна рабіць агляд насьценгазэт.

7. Мы звяртаемся да ўсіх рабкораў Палесдруку, каб яны зьвярнулі увагу на своечасовы выпуск Палесдрукам нашых шматтыражак і асаблівую ўвагу на якасьць іх выпуску.

Узятыя на сябе абавязкі мы пачынаем выконваць і поўнасьцю выканаем.

РАБКОРЫ ЗАВОДУ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА.

Хваля сустрэчных самаабавязацельстваў гомельскіх рабочых

ГОМЕЛЬ. (ПА ТЭЛЕФОНЕ АД [illegible] КАРЭСПАНДЭНТА). ПА ПРАДПРЫЕМСТВАХ ГОМЕЛЯ ШЫРОКА РАЗГАРНУЛАСЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА МЕСЯЧНІКА ДРУКУ І ДА УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ РАБСЕЛЬКОРАЎ.

РАБКОРЫ ЗАВОДАЎ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА, «ПРАЛЕТАРЫ», «КАМІНТЭРН», ЧЫГУННІ, «ПАЛЕСДРУКУ», ФАБРЫКІ «ПРАЦА», «КАЛЕКТЫЎН